włościach podlaskich. Powinności miejskie były w swym głównym trzonie zbliżone do tych, które funkcjonowały w innych miastach tego regionu. Na wsiach zobowiązania wyrastały z tradycji rusko-litewskiej i przypominały te, występujące we wschodniej części województwa podlaskiego oraz na terenach Wielkiego Księstwa Litewskiego[80]. Są to ustalenia wstępne, które muszą zostać potwierdzone przez przyszłe badania szczegółowe.

Summary

Duties of village residents in the Orla estate in the years 1585-1695

The article is devoted to duties of village residents in the Orla estate in Podlachia between 1585 and 1695, when it belonged to the Radziwiłł family of the Biržai-Dubingiai line. The duties described here have been divided into two categories: forms of duty (money, payment in kind, labour) and beneficiary (owner of estate, lessor, religious institution). The article describes the character of those duties and how they changed over the years, as some of them disappeared and others emerged. It is worth mentioning that their rates, as well as forms and manners of their enforcement also evolved.

Key words: duties, Orla, Podlachia, village residents

Змест

Павіннасці жыхароў вёсак Арлянскай маёмасці ў 1585-1695 гадах

Артыкул тычыцца павіннасцей жыхароў вёсак Арлянскай маёмасці на Падляшшы ў 1585-1695 гадах, значыць, у часе, калі яна знаходзілася ва ўладанні Радзівілаў біржанскай галіны гэтага роду. Апісаныя ў артыкуле павіннасці падзелены паводле дзвюх катэгорый: формы павіннасцей (грошы, натура, работа) і адносна таго, на карысць каго яны выконваліся (уласнік маёмасці, арэнда, рэлігійная ўстанова). У артыкуле паказана, як выглядалі тыя павіннасці, а таксама як яны змяняліся на працягу гадоў, паколькі некаторыя з іх знікалі ды з'яўляліся іншыя. Эвалюцыі падвяргаліся іх аб'ём, а таксама форма і парадак іх спагнання.

Асноўныя словы: павіннасці, Орля, Падляшша, жыхары вёскі.

Michał Sierba — doktor historii związany z Uniwersytetem Łódzkim. Zainteresowania badawcze koncentrują się wokół historii społeczno-gospodarczej Rzeczypospolitej w XVI-XVIII w. (przede wszystkim Podlasia), dziejów miast i mieszczaństwa, epidemii chorób zakaźnych w epoce nowożytnej, edytorstwa historycznego i muzealnictwa. W 2017 r. został laureatem stypendium Marszałka Województwa Podlaskiego. Na co dzień pracuje w Centralnym Muzeum Włókiennictwa w Łodzi.

[80] Wskazuje na to m.in. dziakło, które było daniną o rusko-litewskiej metryce. Z. Gloger, *Encyklopedia staropolska*, t. II, Warszawa 1901, s. 105. Patrz: J. Jurkiewicz, *Powinności włościan w dobrach prywatnych w Wielkim Księstwie Litewskim w XVI-XVII w.*, Poznań 1991.

Андрэй Мяцельскі
(Мінск)

Станаўленне мсціслаўскага рубяжа ВКЛ у XVI-XVIII стст.

Пытанні станаўлення дзяржаўнай мяжы XVI — сярэдзіны XVII ст. паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Рускім царствам, у тым ліку і на Пасожжы, пачалі цікавіць гісторыкаў яшчэ ў першай палове XX ст., і перш за ўсё гэта адносіцца да прац Яна Натансона-Лескага, Уладзіслава Гадзішэўскага і Стэфана Кучыньскага[1].

Абапіраючыся на іх распрацоўкі, у другой палове XX — пачатку XXI ст. гэтую працу прадоўжылі іншыя даследчыкі, вынікам чаго сталі як падрыхтаваныя шматлікія мапы, на якіх паказана мяжа Рускага царства з Рэччу Паспалітай[2], так і манаграфіі і шэраг артыкулаў, у якіх закранаюцца пытанні праходжання дзяржаўнай мяжы[3].

Тым не менш, да сённяшняга дня застаюцца не да канца распрацаванымі этапы фарміравання некаторых участкаў мсціслаўскага рубяжа паміж першапачаткова Вялікім Княствам Літоўскім (ВКЛ) і Вялікім Княствам Маскоўскім (ВКМ), а потым мяжы ВКЛ з Рускім царствам і, нарэшце, мяжы паміж Рэччу Паспалітай і Расійскай імперыяй. Пад тэрмінам мсціслаўскі рубеж у дадзеным артыкуле мы разумеем усе ўчасткі мяжы паміж гэтымі дзяржавамі, што прылягалі да Мсціслаўскага княства і ваяводства; мсціслаўска-смаленскі, мсціслаўска-рослаўскі, крычаўска-рослаўскі, крычаўска-бранскі і крычаўска-старадубскі рубяжы.

[1] J. Natanson-Leski, *Dzieje granicy wschodniej Rzeczypospolitej*, cz. 1: *Granica moskiewska w epoce jagiellońskiej*, Lwów — Warszawa, 1922, t. 1, z. 3, ss. 196; W. Godziszewski, *Granica polsko-moskiewska wedle pokoju polanowskiego 1634 (z dwiema mapami)*, [y:] *Prace Komisji Atlasu Historycznego Polski*, z. III, Kraków, 1935, s. 1-114; S. Kuczyński, *Ziemie czernihowsko-siewierskie pod rządami Litwy*, [y:] *Prace Ukraińskiego Instytutu Naukowego*, Warszawa 1936, t. 33, ss. 412.

[2] М. Ф. Спиридонов, *Закрепощение крестьянства Беларуси (XV-XVI вв.)*, Минск 1993, карта ВКЛ XVI века; *Вялікі гістарычны атлас Беларусі*: у 3 тамах, Мінск 2009, т. 1, 244 с.; *Вялікі гістарычны атлас Беларусі*: у 3 тамах, Мінск 2014, т. 2, 347 с.

[3] Н. Б. Шеломанова, *Рославльский уезд в XVI в. (Историко-географический очерк)*, [y:] *Материалы по изучению Смоленской области*, «Московский рабочий» 1974, вып. VIII, с. 165-193; А. А. Мяцельскі, *Воласць Крычава ў XII-XVI стст.: тэрыторыя, адміністрацыйна-гаспадарчы падзел, паселішчы*, «Гістарычна-археалагічны зборнік», 2000, № 15, с. 81-92; той жа, *Лучыцкая воласць у XV-XVIII стст.*, «Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук», 2000, № 4, с. 59-66; той жа, *Старадаўні Крычаў: гістарычна-археалагічны*

Першымі пачалі фарміравацца на пачатку XVI ст. крычаўска-бранскі і крычаўска-старадубскі рубяжы. Пачатак іх фарміравання паклалі падзеі 1500 г., калі князі Сямён Іванавіч Бельскі і Сямён Іванавіч Мажайскі вырашалі разам са сваімі валасцямі перайсці на бок вялікага князя маскоўскага Івана Васільевіча.

Прыняў іх вялікі князь маскоўскі Іван Васільевіч ужо 3 мая 1500 года. Рушыў свае войскі пад кіраўніцтвам Якава Захар'евіча Кошкіна на Бранск і, такім чынам, пачалася вайна паміж ВКЛ і ВКМ 1500-1503 гг. Захоп Масквой пасожскіх валасцей быў імклівым і ўсё адбылося ў 1500 г., бо калі воласці размешчаныя ў міжрэччы Іпуці і Дзясны (Пацынь, Асавік, Варанеч і, верагодна, Салаўянічы з Прыкладнямі) былі «к целованью» прыведзены «тогды когды Дбрянеск»[4] — летам 1500 г., то і астатнія гарады, як сцвярджае летапіс, былі захоплены ў гэты ж год.

«В лето 7008. Бысть бои с Литвою великого князя Ивана Васильевича. .... А се именам тем градом, тогда взяша: Брянескъ, Трубескъ, Почапъ, Радогошъ, Путивль, Любецъ, Чеченескъ, Пропорескъ, Попова Гора, Дроковъ, Мъглинъ ... за княземъ Семеномъ Стародубъ да Черниговъ да Гомии, а за княземъ Василью Путивль да Радогошъ да Северскую землю. И взялъ князъ великий пожаловалъ, придалъ имъ к темъ ихъ городамъ; князю Семену Почапъ, да Мглинъ, да Дроковъ, да Попову Гору, а князю Василь Путивль да Радогощъ, да Северную землю»[5]. Такім чынам, ужо ў 1500 г. дзяржаўная мяжа ВКЛ і Рускага царства выйшла на рубяжы воласці Крычава, былой воласці Мсціслаўскага княства XIV-XV стст. і будучай воласці Мсціслаўскага ваяводства.

Воласці Прыкладні і Салаўянічы былі ўключаны ў Бранскі ўезд ВКМ і стварылі крычаўска-бранскае памежжа. А Мглін, Дрокаў і Папова Гара былі дадзены старадубскаму ўдзельнаму князю Сямёну Іванавічу Мажайскаму, далучаны да Старадубскага ўезда і стварылі крычаўска-старадубскае памежжа.

нарыс гісторыі горада ад старажытных часоў да канца XVIII ст., Мінск 2003, 167 с.; В. Н. Темушев, *Гомельская земля в конце XV — первой половине XVI в. Территориальные трансформации в пограничном регионе*, Москва 2009, 192 с. + карты (Историко-географические исследования); той жа, *Кричевский участок литовско-московской границы в XVI в.*, [у:] *Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы. Научный сборник.*, вып. 3, Мінск 2010, с. 135-165; Е. Б. Французова, *Из истории русско-польских отношений в последней трети XVII в. (по материалам межевых комиссий)*, [у:] *Исторические записки*, т. 105, Москва 1980, с. 280-293.

4 *Сборник Императорского Русского исторического общества* (далей: *СИРИО*), т. 35, издание 2-е, Санкт-Петербург 1892, с. 395.

5 *Полное собрание русских летописей* (далей: *ПСРЛ*), т. 23: *Ермолинская летопись*, Москва 2004, с. 196.

Крычаўска-старадубскае памежжа на працягу XVI — пачатку XVII ст. заставалася спрэчным і ўсе перамірныя граматы, пачынаючы з замірэння 1503 года[6], проста фіксуюць, якія воласці тут адыходзілі да ВКЛ, а якія да Масквы — Папова Гара, Мглін, Дрокаў. Мяжа тут не была дакладна вызначана, адзначалася толькі, што яна праходзіць не па пушчах, а па лясах.

На крычаўска-старадубскім памежжы практычна да 40-х гадоў XVI ст. былі спрэчкі з-за прыналежнасці Алучыцкай воласці, на якую прэтэндавалі абедзве дзяржавы. Нарэшце, у 1533 г. вялікі князь Жыгімонт пайшоў на сілавое вырашэнне гэтай праблемы. Па яго загадзе крычаўскі дзяржаўца Васіль Чыж пачаў прыводзіць жыхароў Алучыцкай воласці да прысягі ВКЛ і арыштаваў маскоўскую адміністрацыю, якая была на тэрыторыі воласці[7].

Вільня ўвесь час спрачалася з Масквой і за воласці Папова Гара і Дрокаў. Але аб гэтых валасцях у 1533 г. Масква нават не збіралася размаўляць, сцвярджаючы, што гэта яе ўласнасць[8].

Вайна паміж Масквой і Вільняй 1534-1537 гг. паказала пэўную раўнавагу сіл. І хаця ВКЛ адваявала Гомель, вярнуць Смаленск і Рослаў не змагло. Больш таго, зноў узніклі праблемы з Алучыцкай воласцю. Масква патрабавала прызнання Вільняй прыналежнасці ёй усёй воласці і іншых спрэчных тэрыторый. Але вялікі князь Жыгімонт не пагаджаўся з прэтэнзіямі Масквы. На перамовах літоўскія паслы прапанавалі перадачу Маскве за яе воласць горада Завалочча з валасцямі Няведра і Істцо на паўночным усходзе ВКЛ.

Першапачаткова маскоўскія баяры адмаўлялі гэтыя прапановы, кажучы: «никакож государю нашаму тех волостей и сёл не поступитися, а королевы ему волости в тех волостех место к Заволочью не надобно». Але праз некаторы час яны пайшлі на размен: за Себеж, Завалочча і прыпісаную да Завалочча Долыскую воласць Масква пагадзілася прызнаць пераход пад уладу ВКЛ Гомія з воласцю і непералічаных у грамаце нейкіх крычаўскіх і чачэрскіх сёлаў. У той жа час маскоўскія баяры адмаўляліся запісваць у бок ВКЛ Алучыцкую воласць, сцвярджаючы, што Вільня трымае яе сілай. Нарэшце, пытанне па спрэчных валасцях у 1537 г. было вырашана па прынцыпе «хто сильнее, тот и держит»[9] і ў выніку замірэння 1537 г. Алучыцкая воласць засталася ў складзе ВКЛ.

[6] *Литовская метрика. Книга записей № 5 (1427-1506)*, Vilnius 1993, s. 323-324.
[7] *СИРИО* , т. 35, с. 708-709, 716-717, 751, 789, 833, 837, 843, 860-861.
[8] *СИРИО*, т. 35, с. 856.
[9] *СИРИО*, т. 59, Москва 1887, с. 102-103, 105.

Падчас чарговых перамоў аб працягу замірэння 1542 г. Вільня зноў узняла пытанне аб прыналежнасці Маскве Чарнігава, Мгліна, Паповай Гары, Дрокава, Себежа, Веліжа і Завалочча, прапануючы за іх вярнуць шматлікіх рускіх палонных. Вялікі маскоўскі князь Іван Жахлівы даў згоду на саступку за вяртанне рускіх палонных толькі Дрокава, аднак паслы ВКЛ адмовіліся падпісваць якое-небудзь пагадненне адносна гэтай прапановы, таму што не было інструкцый ад караля Жыгімонта, і згодна з замірэннем 1542 г. Дрокаў застаўся за Рускім царствам[10].

Ды і ўсе наступныя перамовы аб працягу замірэнняў паміж ВКЛ і Рускім царствам сярэдзіны — другой паловы XVI ст. паказваюць, што Вільня лічыла незаконным валоданне Масквой землямі размешчанымі паміж Беседдзю і Дзяснай і выстаўляла прэтэнзіі на іх. У сваю чаргу, з 50-х гадоў XVI ст. Масква пачала вылучаць прэтэнзіі на Падняпроўе і Падзвінне.

Акрамя дыпламатычнай барацьбы на крычаўска-старадубскім рубяжы на працягу ўсяго XVI ст. адбываліся паходы на сумежныя землі як з боку ВКЛ, так і з боку Рускага царства. Рускія ваяводы ўвесь час фіксуюць напады і захопы валасцей Рускага царства з боку ВКЛ. Так у выпісе са спісу пасольства Афанасія Разанава, складзенага ў 1593 г., згадваецца, што з Чачэрска «люди приходят в Стародубский уезд Поповы Горы да в волость Дроковскую и многие обиды литовские люди чинят, бортников пытками пытают и огнём жгут и животы их поимали и завладели Драковскою волостью в длину на 5 верст а поперек на 2 версты. Да тое ж волости розбили деревню Кузнецы и бортников побили и вотчинами их и бортными ухожаи завладели, и от того их воровства многие деревни в тех волостях запустели». Тут жа адзначаецца, што і з Крычава ажыццяўляюцца напады на старадубскія сёлы, а з Мсціслава на бранскія і смаленскія валасці[11].

Аднак трэба прызнаць, што гэтыя напады не ўнеслі значных змяненняў у праходжанне дзяржаўнай мяжы на крычаўска-старадубскім рубяжы, і калі адбываліся нейкія перамены, то яны насілі выключна мясцовы характар.

Фарміраванне крычаўска-бранскага рубяжа, якое таксама пачалося падчас вайны 1500-1503 гг., адбывалася больш складаней. Гэты рубеж знаходзіўся на ўсходзе воласці Крычава, і яму прысвечана большая частка артыкула Віктара Цемушава аб крычаўскім участку літоўска-маскоўскай мяжы. У ім В. М. Цемушаў усходнюю мяжу воласці Крычава XVI ст. праводзіць па р. Іпуць. Гэтая ж думка працягваецца

[10] *СИРИО*, т. 59, с. 159-161, 190.

[11] Г. Н. Анпилогов, *Новые документы о России конца XVI — начала XVII века*, Москва 1967, с. 86, 99, 101, 433-437.

і ў яго манаграфіі, прысвечанай фарміраванню ўсходняй мяжы ВКЛ у сярэдзіне XIV — першай палове XVI ст.[12]. Між тым ніякіх фактаў для правядзення ўсходняй мяжы воласці Крычава па р. Іпуць ён не прыводзіць, а аналізаваны ім матэрыял, наадварот, адводзіць нас на захад ад р. Іпуць. Як жа фарміравалася ўсходняя мяжа воласці Крычава, па якой у XVI-XVIII стст. праходзіў крычаўска-бранскі рубеж?

Складанасць у вызначэнні крычаўска-бранскага рубяжа дзяржаўнай мяжы ВКЛ і ВКМ адзначала яшчэ Ніна Шаламанава[13] бо ён, як і ўсё крычаўскае памежжа, заставаўся спрэчным не толькі на працягу XVI — пачатку XVII ст., але спрэчкі па ім ішлі да першага падзелу Рэчы Паспалітай. Менавіта таму, што памежныя спрэчкі канчаткова так і не былі вырашаны, усе перамірныя граматы, проста фіксуюць, якія воласці адыходзяць да ВКЛ, а якія да Масквы — Папова Гара, Мглін, Дрокаў, Прыкладні, Салаўянічы.

Барацьба за страчаную воласць Прыкладні, улічваючы, што яна была шчыльна звязана з Крычавам як мінімум з першай паловы XV ст., бо менавіта крычаўскі намеснік выбіраў з Прыкладняў вялікакняскую даніну[14], распачалася адразу пасля яе захопу Масквой.

Не паспела высахнуць чарніла пад замірэннем 1503 г., як у лістападзе 1503 — лютым 1504 г. рускія намеснікі з памежных валасцей скардзіліся, што «... наместник дбрянский князь Василий Семенович Раповловский к нам приказывал а сказывает, что наместник кричевский Остафей Дашкович вступает в волость в Прикладни и в деревни его прикладненские, да и опроче того, сказывает многие обиды чинятся нашым людем от кричевцев и он сказывает к Дашковичю посылал управы просяти, а он ни въ чёмъ управы не даетъ»[15].

Дзе дакладна праходзіла ўсходняя мяжа воласці Крычава пасля вайны 1500-1503 гг. з зараз ужо бранскімі валасцямі, крыніцы не паведамляюць, як і невядома дакладна, дзе праходзіла заходняя мяжа валасцей Прыкладні і Салаўянічы.

Уладзімір Крашанціннікаў лакалізуе гэтыя воласці на падставе матэрыялаў XVII ст. на левым беразе р. Іпуць, вышэй упадзення ў яе р. Надвы[16], таму і В. М. Цемушаў на распрацаваных ім мапах даво-

[12] В. Н. Темушев, *Кричевский участок литовско-московской границы...*, с. 137; В. М. Цемушаў, *На ўсходняй мяжы Вялікага Княства Літоўскага (сярэдзіна XIV — першая палова XVI ст.)*, Смаленск 2014, с. 315-335, карты № 29-30.

[13] Н. Б. Шеломанова, *Рославльский уезд в XVI в...*, с. 184.

[14] *Документы Московского архива Министерства юстиции* (далей: *ДМАМЮ*), Москва 1897, т. 1, с. 1.

[15] *СИРИО*, т. 35, с. 447.

[16] В. В. Крашенинников, *Брянский уезд в XVI — первой половине XIX в. (историко-географический обзор)*, [у:] *Из истории Брянского края. Материалы юби-*

дзіць крычаўска-бранскае памежжа на р. Іпуць да ўпадзення ў яе ракі Надвы, дзе пачыналася Дрокаўская воласць.

Пастулатам для гэтага стаў фрагмент з перамоў 1523 г. пра парубежнае размежаванне, у якім сцвярджалася, што «Ипуць — рубеж кричевский»[17]. Абапіраючыся менавіта на гэты адзіны сказ (ён ніколі болей не згадваецца не толькі падчас перамоў 1523-1527 гг., але і падчас іншых перамоў XVI — пачатку XVII ст.), В. М. Цемушаў і зрабіў выснову, што ўсходняя мяжа воласці Крычава ішла па р. Іпуць. Хаця аналізаваны ім у далейшым матэрыял, наадварот, адводзіць нас на захад ад р. Іпуць.

На наш погляд, В. М. Цемушаў не звярнуў увагі на агульны сэнс таго, пра што ідзе гаворка ў дадзеным выпадку, што і прывяло яго да памылковага правядзення дзяржаўнай мяжы паміж Масквой і Вільняй у гэтым рэгіёне ў XVI ст. па р. Іпуць.

У цытаваным В. М. Цемушавым фрагменце аб мяжы гаворка ідзе выключна пра рубяжы Рослава з іншымі валасцямі, як з валасцямі ВКЛ, так і з «рускімі» — бранскімі валасцьмі. Улічваючы, што Рослаў з 1516 г. належаў Маскве, то ў дадзеным выпадку, гаворачы пра рослаўска-бранскі рубеж, які ішоў па р. Вараніцы да яе ўпадзення ў Іпуць, а потым дапаўняючы, што «Ипуць — рубеж кричевский», тут трэба весці крычаўскі рубеж не ўніз па Іпуці, як гэта зрабіў В. М. Цемушаў, а ўверх, дзе сапраўды воласць Рослава межавала з воласцю Крычава.

Уніз ад упадзення р. Вараніцы ў р. Іпуць былі з 1500 г. маскоўскія воласці Прыкладні і Салаўянічы і мяжа крычаўскай воласці туды не магла ісці. Ды і падчас перамоў 1522 г. добра апісанае крычаўска-рослаўскае памежжа вядзе нас па Іпуці, але ўжо не даходзіць да ўпадзення ў яе р. Вараніцы: «... а отъ Кричева городу Рославлю рубежъ реке Шумяча, а Шумячею въ реку въ Немелицу, а изъ Немелецы старымъ рубежомъ къ Заборью въ Ипутъ реку, да на низъ Ипутью къ Хмелю»[18].

Згаданае Забар'е гэта яшчэ адносна нядаўна існаваўшая в. Красназабар'е Ершыцкага раёна Смаленскай вобласці. Ад яго рослаўска-крычаўскі рубеж ішоў па Іпуці да Хмеля, які згодна з прапановай Н. Б. Шаламанавай размяшчаўся паміж Забар'ем і правым прытокам Іпуці р. Хвошняй, дзе на пачатку XVII ст. знаходзіўся на рускіх землях за-

лейной историко-краеведческой конференции, посвящённой 50-летию образования Брянской области и 50-летия Победы в Великой Отечественной войне, Брянск 1995, с. 123-125.

17 *ДМАМЮ*, с. 66.

18 *СИРИО*, т. 35, с. 639.

пусцелы Хмелеўскі бортны «ухажай», селішча Хмель, селішчы Забар'е і Давыдавічы, якія запусцелі «в разоренье от литовских людей», з чым пагаджаецца і В. М. Цемушаў[19]. Тут заканчвалася крычаўска-рослаўскае памежжа і, верагодна, пачынаўся крычаўска-бранскі рубеж па выніках перамоў 1522-1527 гг.

Як бачым, зараз крычаўска-рослаўскае памежжа не даходзіць да р. Вараніцы, таму можна сцвярджаць, што ўжо па выніках перамоў 1522-1527 гг. Вільня вымушана была саступіць частку сваіх зямель на правым беразе р. Іпуць.

Таму калі ўсходняя мяжа воласці Крычава і ішла па р. Іпуць да р. Надва, як гэта паказвае В. М. Цемушаў, то гэта было толькі на самым пачатку XVI ст. Магчыма, яшчэ ў 1516 г., калі Рослаў быў у складзе ВКЛ, воласць Крычава даходзіла да вусця р. Вараніцы. Аднак падчас вайны 1512-1522 гг. Масква не толькі захапіла Рослаў (1516 г.?), але хутчэй за ўсё змагла захапіць і некаторыя землі на правым беразе Іпуці і не саступала іх ВКЛ. Вось чаму на перамовах 1522-1527 гг. толькі аднойчы ўзнікла пытанне пра стары рубеж Крычава з Рославам па р. Іпуць, які пачынаўся ад р. Вараніцы.

Ва ўсіх перамірных граматах, пачынаючы з 1527 г. і да 1608 г., крычаўска-рослаўскае памежжа заставалася стабільным і запісвалася па старому: «... а отъ Кричева городу Рославлю рубежъ ... а изъ Немелецы старымъ рубежомъ къ Заборью въ Ипутъ реку, да на низъ Ипутью къ Хмелю»[20]. А вось крычаўска-бранскае памежжа крыніцы абыходзяць маўчаннем з-за таго, што яно заставалася спрэчным у першай палове XVI — першай палове XVII ст., і як яно рэальна мянялася можна рэканструяваць толькі абапіраючыся на розныя ўскосныя паведамленні.

Распачатая вайна 1534-1537 гг. ВКЛ і Рускага царства зноў прыводзіць нас на крычаўска-бранскае памежжа. Воласць Крычава была раёнам баявых дзеянняў і, мяркуючы па глухіх звестках яна, як і воласць Чачэрска, страціла частку населеных пунктаў, якія так і не былі вернуты падчас перамоў 1536-1537 гадоў. У сваю чаргу, крычаўцы і пасля гэтай вайны нападалі на воласць Прыкладні. У 1537-1538 гг. бранскі намеснік скардзіўся, што «... из Кричева вступаютца в Брянскую волость, в Прикладни ... и людеи бьют и грабят и головами сводят»[21].

[19] Н. Б. Шеломанова, *Рославльский уезд в XVI в....*, с. 182-183; В. М. Цемушаў, *На ўсходняй мяжы Вялікага Княства Літоўскага...*, с. 325.

[20] *СИРИО*, т. 35, с. 639; *Литовская метрыка. Knyga Nr. 593 (1585-1604)*, Vilnius 2009, с. 219; *СИРИО*, т. 137, Москва 1912, с. 701.

[21] *СИРИО*, т. 59, с. 103-105, 164.

Менавіта пасля гэтай вайны з'яўляюцца новыя апорныя кропкі, якія дазваляюць больш упэўнена маркіраваць крычаўска-бранскае памежжа. Калі раней мы мелі толькі адну кропку, з якой маглі пачынаць прасочваць тут памежжа і ім была на ўсходзе Хмеля р. Хвошня, то зараз, кажучы пра ўсходнія раёны Крычаўскага староства «Агранічэнне воласці Крычава» 1560 г. вядзе яе мяжу і, верагодна, крычаўска-бранскае памежжа, з р. Іпуць «рубяжамі» праз нелакалізаваныя зараз ручай Бальчэвіцу, р. Арлоўку на р. Крупню, ручай Студзёны, на р. Беседзь і потым у р. Альхоўку (суч. Альшанку)[22], адкуль ужо выводзіла на р. Вітаву, дзе пачынаўся крычаўска-старадубскі рубеж.

Хаця як і раней у перамірных граматах сярэдзіны XVI ст. афіцыйна мяжа фіксавалася па старому — «... въ Ипутъ реку, да на низъ Ипутью къ Хмелю». Апошняе сведчыць пра спрэчнасць гэтага бортнага «ухажая» Хмель, размешчанага на правым беразе р. Іпуць у сярэдзіне XVI ст.

Калі кірунак праходжання мяжы з Іпуці на поўдзень не зусім зразумелы, то яе праходжанне па Беседзі ўскосна пацвярджаюць і існуючыя на яе правым (крычаўскім) беразе населеныя пункты Ліцвінава і Ліцвінава Буда — вёскі Ершыцкага раёна Смаленскай вобласці, назвы якіх сведчаць пра іх былую прыналежнасць Літве. З такім праходжаннем мяжы згодны і Вячаслаў Насевіч, які праводзіць мяжу з р. Беседзі прама на поўнач на Іпуць[23].

Землі Сярэдняга Пасожжа заставаліся спрэчнымі і пасля 1560 г., і нават перад утварэннем Мсціслаўскага ваяводства (1564-1565 гг.), верагодна, адбылося чарговае скарачэнне воласці Крычава ўздоўж р. Іпуць.

Падчас Інфлянцкай вайны ў 1562 г. пачаліся баявыя дзеянні на Пасожжы. Летам маскоўскі ваявода князь П. С. Сярэбраны паліў Крычаў і Мсціслаў, а са Старадуба князь Р. Мяшчэрскі ваяваў Магілёў, Прапойск і Чачэрск[24]. Вайна была няўдалай для ВКЛ і, верагодна, Крычаўская воласць панесла пэўныя тэрытарыяльныя страты, бо менавіта ад крычаўскага дзяржаўцы А. Б. Шалухі кароль Жыгімонт патрабаваў, каб той падчас перамоў «за границу в землю Московскую сам не ходил и слугам своим и подданым и козаком нашим ходити не казал и никоторых шкод и зачепок чинити не велел». Адначасова яму загадвалася набіраць людзей у войска, прычым запрашаліся як вольнанаёмныя за грошы, так і давалася разнарадка — з воласці «з деся-

[22] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, ф. 694, воп. 4, адз. зах. 1155, арк. 68.
[23] *Вялікі гістарычны атлас Беларусі*, т. 1, с. 121, 131.
[24] *ПСРЛ*, т. 13: *Патриаршая или Никоновская летопись*, Москва 1965, с. 340, 343.

ти служб одного чоловека», мяшчанам «з девяти чоловеков десятого выправили»[25].

Тым не менш, баявыя дзеянні рускіх войскаў у наваколлях Крычава і Мсціслава адзначаюцца ў студзені і ліпені-жніўні 1564 г., падчас якіх палілі гарады і вёскі, быў узяты вялікі палон[26]. Нельга выключыць, што менавіта пасля гэтай вайны крычаўска-бранскае памежжа вузкай паласой уздоўж р. Іпуці прасунулася на захад да яе правага прытоку р. Маскоўкі, хаця як і раней мяжу ў перамірных граматах працягвалі запісваць па старому — «... въ Ипутъ реку, да на низъ Ипутью къ Хмелю».

Пра тое, што крычаўска-бранскае памежжа некалькі змянілася ў другой палове XVI ст., а Інфлянцкая вайна паміж Рэччу Паспалітай і Рускім царствам была апошняй вайной у тым стагоддзі, калі мяжа магла змяніцца на карысць Расіі, сведчаць і апорныя кропкі для яе правядзення з рускага боку.

Так, у 1610 г. вялікі князь Жыгімонт Ваза Істоме і Саве Васільевым, дзецям Кузенева, у Бранскім уездзе даў «вотчыны і памесці іх — урочышча Кузмінічы і селішча Дабраносавічы»[27].

Вёска Дабраносавічы знаходзіцца на правым беразе р. Іпуць недалёка ад р. Хвошня, а ўрочышча Кузмінічы, верагодна, трэба шукаць у наваколлях сучаснай в. Кузьмічы Ершыцкага раёна, якая размяшчаецца на ўсходнім (бранскім) беразе р. Беседзь.

Падобная сітуацыя была і з Іванам Фёдаравым, сынам Строкіна, рослаўскім ваяводам. У 1610 г. вялікі князь Жыгімонт даў яму вотчыны яго ў Бранскім уездзе сяльцы Хвошню і Ліпава з вёскамі і з пачынкамі, з лесам, з бортнымі і іншымі ўходамі[28].

Сяльцо Хвошня, верагодна, знаходзілася на аднайменнай рэчцы. А сяльцо Ліпава, магчыма, знаходзілася каля сённяшняй в. Ліпаўка Хоцімскага раёна, недалёка ад вярхоўяў р. Альшанка, дзе ў 1637 г. згадваецца «ліпавы бор»[29] падчас апісання размежавання паміж Масквой і Варшавай.

Улічваючы, што гэта былі вотчыны, то можна смела апускаць ніжнюю мяжу пачатку валодання гэтымі землямі як мінімум на 20-30

[25] *Русская историческая библиотека*, т. 30: *Литовская метрика. Отделы первый и второй. Часть третья: Книги публичных дел. Том первый*, Юрьев 1914, с. 750-752.

[26] *ПСРЛ*, т. 13, с. 377, 385.

[27] *Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией*, т. 4: *1587-1632 гг.*, Санкт-Петербург 1851, с. 333.

[28] Там жа, с. 343.

[29] Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў (далей: РДАСА), ф. 79, воп. 1, адз. зах. 12, арк. 8.

гадоў (у 1580-1590 гг.) і лічыць, што ў той час гэта былі землі Рускага царства і шукаць крычаўска-бранскае памежжа ў гэтым месцы яшчэ ў другой палове XVI ст., а можа быць і некалькі раней.

Гэтую ж думку пацвярджае і запіс пісцовай кнігі Бранскага ўезда 1625-1629 гг., што ад р. Хвошні ўверх па Іпуці да р. Маскоўкі знаходзіўся запусцелы Хмелеўскі бортны «ухажай», селішча Хмель, які належаў яшчэ дзеду ўладальніка Івану Сяргеевічу Зарубіна-Шатара. Тут жа на Іпуці знаходзяцца селішчы Забар'е і Давыдавічы, якія запусцелі «в разоренье от литовских людей» і сюды даходзілі землі бранскай воласці Прыкладні («Волость Прикладненская, что на литовском на рословском рубеже»)[30].

Улічваючы, што ўладальнікам гэтых маёмасцей быў дзед Івана Сяргеевіча, то пачатак уладання ім гэтых зямель можна апусціць як мінімум на 30-40 гадоў, у 70-80-я гады XVI ст. А гэта нас падводзіць да часоў Інфлянцкай вайны. Улічваючы, што дзед Івана Сяргеевіча Зарубіна-Шатара валодаў селішчам Забар'е, то рэальнае крычаўска-бранскае памежжа праходзіла на захад не толькі ад р. Іпуці, але і на захад ад Забар'я.

Юрыдычна гэты раён заставаўся спрэчным да пачатку XVII ст. і на перамовах па замірэннях яго працягвалі запісваць па-старому, як быццам бы бортны Хмелеўскі «ўхажай» належаў ВКЛ. А ў рэальнасці гэтыя землі ўжо асвойвала Рускае царства і адзінае, што магла зрабіць Рэчь Паспалітая, гэта не даваць тут ім спакойна жыць. Вось адкуль і сцвярджэнне пра тое, што на пачатку XVII ст. селішчы Забар'е і Давыдавічы запусцелі «в разоренье от литовских людей»[31].

Ускосныя пацверджанні таго, што крычаўска-бранскае памежжа ў другой палове XVI ст. праходзіла на захад ад Забар'я, мы знаходзім у парубежным размежаванні паміж Рэччу Паспалітай і Рускім царствам пасля Смаленскай вайны 1632-1634 гг.

У 1635-1637 гг. адбываліся з'езды паслоў на месцах, у выніку чаго было праведзена новае размежаванне. Прычым праца гэта зацягнулася з-за адразу ж успыхнуўшых спрэчак, і на бранскім участку дзяржаўнай мяжы канчаткова размежаванне было завершана толькі ў 1647 г.[32]

У выніку парубежнага размежавання ў 1637 г. на Сярэднім Пасожжы паміж Рэччу Паспалітай і Рускім царствам быў дакладна прапісаны крычаўска-бранскі рубеж, які заставаўся спрэчным нават пры зна-

[30] Н. Б. Шеломанова, *Рославльский уезд в XVI в....*, с. 182-183.

[31] Там жа.

[32] Н. Б. Шеломанова, *Документы государственного межевания 30—40-х годов XVII в.*, [у:] *Археографический ежегодник за 1971 г.*, Москва 1972, с. 165.

ходжанні Крычава і Бранска ў адзінай дзяржаве на пачатку XVII ст. Пра гэта сведчыць розніца тых геаграфічных маркёраў, на якія абапіраліся як крычаўскія, так і бранскія «старожильцы» пры апісанні зямельных уладанняў, размешчаных у вярхоўях рэк Іпуці і Беседзі.

Крычаўскія «старожильцы» ўказвалі, што рубеж ішоў уверх па р. Іпуць ад месца ўпадзення р. Савенкі (Асоўны), а потым зварочваў у р. Путынку, адкуль ішоў на Голае балота[33]. Улічваючы, што на карце памежжа Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі 1766 г. Голае балота паказана ў вярхоўях сучаснай р. Маскоўка, што ўпадае з правага боку ў р. Іпуць[34], то згадваная ў 1637 г. рака Путынка з'яўляецца сучаснай р. Маскоўкай.

З Голага балота мяжа, згодна са звесткамі крычаўцаў, павінна ісці на вярхоўі р. Беседзь і па Беседзі спускацца ўніз на Палуцкае «станавішча», якое на карце 1766 г. паказана насупраць в. Ціхань у месцы ўпадзення р. Рэкта ў Беседзь. Адтуль па нелакалізаванай зараз рэчцы Палуцкай мяжа павінна ісці ўверх на Княжае балота (на карце 1766 г. паказана насупраць в. Маркаўка на левым беразе р. Беседзь), адтуль р. Альшанкаю мяжа ішла ўніз на старое «масцішча» і сухадолам на вярхоўі р. Вялічаўкі (сучасная р. Жадунька), адтуль на р. Ліпаўку, потым на селішча Юдзіцкае, у бор Пагарэльскі, у вярхоўі р. Еленавой (Еленка?[35]) і ўжо адтуль у р. Вітаву[36].

Такім чынам, зыходзячы з прапаноў крычаўскіх «старожильцев» аб правядзенні дзяржаўнай мяжы можна зрабіць выснову, што мяжа Крычаўскай воласці першай паловы XVII ст. часткова не адпавядала мяжы Крычаўскага староства 1560 г., бо крычаўцы не прэтэндавалі на землі, размешчаныя на ўсход ад сучаснай в. Маскоўка, але лічылі сваім правы бераг р. Беседзь. І адзіным перыядам, калі маглі адбыцца гэтыя змяненні ў праходжанні крычаўска-бранскага рубяжа, з'яўляюцца вынікі баявых дзеянняў рускіх войскаў у Крычаўскай воласці падчас кампаній 1562-1564 гг. Бо гэта быў адзіны перыяд у другой палове XVI — пачатку XVII ст., калі Масква магла пашырыць свае ўладанні на Пасожжы.

І хаця рэальна ўладанні Масквы ўжо ў другой палове XVI ст. прасунуліся ўздоўж Іпуці на захад ад Забар'я, афіцыйна падчас падпісання новага замірэння ў 1608 г. крычаўска-рослаўскі рубеж прапісваўся па-

[33] РДАСА, ф. 79, воп. 1, адз. зах. 12, арк. 7.

[34] Archiwum Główne Akt Dawnych (далей: AGAD), Zbiór Kartograficzny, teka 509, nr 2, 8.

[35] П. Л. Маштаков, *Список рек Днепровского бассейна с картой и алфавитным указателем. Изданный при Императорской Академии наук комиссией по вопросу о географической номенкулатуре*, Санкт-Петербург 1913, с. 125.

[36] РДАСА, ф. 79, воп. 1, адз. зах. 12, арк. 7.

старому: «... а изъ Немелецы старымъ рубежомъ къ Заборью въ Ипутъ реку, да на низъ Ипутью къ Хмелю»[37].

Новы рубеж паміж Крычавам і Бранскам быў зафіксаваны падчас размежавання 1637 г. Пра геаграфічныя маркёры крычаўцаў мы пісалі вышэй. Але сітуацыя для крычаўцаў па выніках вайны 1632-1634 гг. была даволі складанай, бо бранскія паслы ў 1637 г. патрабавалі, каб мяжа з р. Іпуць ішла р. Маскоўкаю на Чалае (Голае?) балота, адтуль нелакалізаванай зараз рэчкай Частыкаўскай на р. Суроў, потым сухадолам на р. Мужычок, адтуль праз рэчкі Трукцінаўку (суч. р. Трасцінка, правы прыток р. Мужычок) і нелакалізаваны ручай Нявашу на р. Беседзь. На Беседзь мяжа павінна была выходзіць паўднёвей сучаснага Хоцімска, бо згодна са сведчаннем бранскіх «старожильцев» мяжа па р. Беседзь падымалася ўверх да вусця р. Альшоўкі, адкуль лесам і сухадолам павінна была ісці на р. Вітаву[38].

Такім чынам бранскія паслы прапанавалі правесці мяжу на 10-20 км на захад ад мяжы, якую прапаноўвалі крычаўцы. Такая разбежка ў правядзенні мяжы ў вытоках рр. Іпуць і Беседзь тлумачыцца не толькі слабай заселенасцю гэтай тэрыторыі яшчэ на пачатку XVII ст., дзе існавалі адзінкавыя вёскі Крычаўскага староства і не было шляхецкіх уладанняў.

Бранскія «старожильци» фактычна тут выстаўлялі прэтэнзіі да той мяжы, дзе на наш погляд праходзіла мяжа паміж валасцямі Крычава і Зароя ў XII-XIII стст.[39] Улічваючы, што воласць Зароя папярэднічала існаванню воласці Прыкладні, магчыма, тут мы бачым спробу адрадзіць заходнюю мяжу воласці Прыкладні, якая, верагодна, была разарвана паміж ВКЛ і Рускім царствам падчас войнаў першай паловы XVI ст., але памяць пра заходнюю мяжу якой яшчэ захоўвалася.

Аднак пасля перамоў паслы прыйшлі да кампрамісу, і 20 кастрычніка 1637 г. адносна бранска-крычаўскага ўчастка мяжы Рускага царства і Рэчы Паспалітай было складзена афіцыйнае размежаванне.

Мяжа з р. Іпуць ішла ўверх па р. Маскоўцы, адтуль на «Чалае балота», потым на вытокі р. Рэкта. Ракой Рэкта мяжа спускалася ў р. Беседзь, а далей ішла ў р. Альшоўку. Пры гэтым прызнавалася, што левыя берагі рэк Рэкты, Беседзі з'яўляюцца бранскімі, а правыя — крычаўскімі. Па р. Альшанцы мяжа ішла да рэчкі Вялічоўкі, адкуль падымалася да «бору ліпавага», размешчанага каля в. Ліпаўка.

[37] *СИРИО*, т. 137, с. 701.
[38] РДАСА, ф. 79, воп. 1, адз. зах. 12, арк. 7 адв.
[39] А. А. Мяцельскі, *Мсціслаўскае княства і ваяводства ў XII-XVIII стст.*, Мінск 2010, с. 80, 92.
[40] РДАСА, ф. 79, воп. 1, адз. зах. 12, арк. 7 адв.-10.

Далей мяжа паміж Рэччу Паспалітай і Рускім царствам пятляла і ў якасці апорных кропак згадваюцца насыпаныя капцы і высечаныя «грані» на дрэвах, рэчкі Ліпаўка і Зімніца, а потым выводзіла на р. Вітаву[40]. Практычна толькі ў гэты час мяжа паміж Рэччу Паспалітай і Рускім царствам у лукавіне р. Іпуць выйшла на тыя рубяжы, якія прапанаваў на сваёй мапе Міхаіл Спірыдонаў[41].

Вайна паміж Рэччу Паспалітай і Рускім царствам 1654-1667 г. прывяла да вялікіх тэрытарыяльных страт Рэчы Паспалітай, у выніку якой яна страціла Смаленшчыну і Севершчыну. Тым не менш, па выніках Андрусаўскага замірэння 1667 г., заключанага на 13,5 года, рускі бок прыняў на сябе абавязак «... не переходя границ воеводства ... Мстиславского, поветов Оршанского, Мозырского, Речицкого и Браславского ... такъ, как в давнем давном своем очертании до войны имели»[42]. Такім чынам, хаця падчас вайны 1654-1667 гг. частка зямель (засожскія землі — землі размешчаныя на левым беразе р. Сож)[43] былі захоплены казакамі Васіля Залатарэнкі, па выніках Андрусаўскага замірэння межы Мсціслаўскага ваяводства на пэўны час засталіся стабільнымі, як яны сфарміраваліся на працягу другой чвэрці XVI — пачатку XVII ст.

Андрусаўскае пагадненне паміж Рэччу Паспалітай і Рускім царствам выклікала незадавальненне сярод казацкага кіраўніцтва, аднак пасля паўстання І. М. Брухавіцкага казацкае кіраўніцтва стала на шлях супрацоўніцтва з царскай уладай дзеля таго, каб такім чынам дабіцца сваіх інтарэсаў. Тым болей, што праблема прыналежнасці засожскіх зямель увесь час успыхвала.

У 1669-1671 гг. казакі гетмана Дзям'яна Мнагагрэшнага захапілі засожскія землі Мазырскага і Рэчыцкага паветаў. Аднак перад пачаткам барацьбы Турэцкай Порты за Украіну Масква вырашала не сапсаваць узаемаадносін з Рэччу Паспалітай і, карыстаючыся тым, што супраць Д. Мнагагрэшнага быў арганізаваны пераварот, яго зрабілі вінаватым, а засожскія землі былі вернуты Рэчы Паспалітай[44]. Тым не менш, барацьба за засожскія землі, у тым ліку за частку тэрыторыі Мсціслаўскага ваяводства цягнулася да заключэння Вечнага міру 1686 г. паміж Рэччу Паспалітай і Рускім царствам.

Ужо на пачатку 1683 г. казакі Старадубскага палка І. Самайловіча захапілі землі Рэчыцкага і Мазырскага паветаў і частку Мсціслаўска-

[41] М. Ф. Спиридонов, *Закрепощение крестьянства Беларуси (XV-XVI вв.)*, карта ВКЛ XVI века.

[42] *Полное собрание законов Российской империи. Собр. 1-е.*, т. I: *С 1646 по 1675 гг.*, Санкт-Петербург 1830, с. 633.

[43] М. Грушевський, *Історія України-Руси*, т. 9, Київ 1997, с. 929-933.

га ваяводства па р. Сож, выгналі адтуль шляхту і пачалі арганізоўваць там сваё кіраўніцтва[45].

Сітуацыя была такой складанай, што сеймік Мсціслаўскага ваяводства, не чакаючы дыпламатычнага вырашэння праблемы паміж Масквой і Варшавай, накіраваў свайго прадстаўніка ў Маскву. А пакуль накіраваў Аўгустына Канстанціновіча ў Смаленск для перамоў з рускім дыпламатычным агентам Назарыем Краеўскім.

Масква ўвесь час спрабавала адкласці вырашэнне гэтай праблемы, матывуючы тым, што яна не парушала замірэнне і што гэты раён з'яўляецца спрэчным. Казакі захапілі каля 178 вёсак і патрабавалі наогул, каб усё Засожжа было далучана да Гетманшчыны, абгрунтоўваючы тым, што Сож вельмі зручны натуральны рубеж паміж Рэччу Паспалітай і Рускім царствам. На думку казацкага начальства мяжа па Сожы павінна была ісці ад Гомеля да Рослава, а самі землі, на думку гетмана Івана Самайловіча, павінны былі быць далучаны да Старадубскага палка[46].

Жаданне І. Самайловіча ўтрымаць любымі сродкамі захопленыя землі не магло не выклікаць незадавальнення ў Маскве, хаця там існавала партыя пад кіраўніцтвам П. Празароўскага і Ф. П. Салтыкова, якая падтрымлівала яго[47]. Тым не менш, кіраўнік рускага знешнепалітычнага ведамства князь Васіль Галіцын лічыў, што для Рускага царства, улічваючы напружаныя ўзаемаадносіны з Турцыяй, неабходна было нарэшце атрымаць мірную дамову з Рэччу Паспалітай.

Таму, пачынаючы з лютага 1686 г., пачаліся новыя перамовы аб заключэнні мірнай дамовы і тут адным са значных пытанняў стала прыналежнасць засожскіх зямель. Нягледзячы на супраціўленне рускай дыпламатыі[48], патрэба Расіі ў мірнай дамове з Рэччу Паспалітай вымусіла Расію ахвяраваць засожскімі землямі, без уліку патрабаванняў казакоў.

Згодна з восьмым раздзелам «Вечнага міру» 1686 г.: «А что в прошедшие перемирные лета в надежде сего вечного мира из завоеванных городов и земель уступлены суть королевского величества суть

[44] К. А. Кочегаров, *Посожский конфликт*, партал «iPages.ru» (дата доступа: 10.01.2016), <http://www.ipages.ru/index.php?ref_dl=1&ref_item_id=3771>.

[45] J. Perdenia, *Stanowisko Rzeczypospolitej szlacheckiej wobec sprawy Ukrainy na przełomie XVII-XVIII w.*, Wrocław — Warszawa — Kraków 1963, s. 30.

[46] *Літопис Самовидця: [Історіогр. пам'ятка другої» половини XVII ст.]*, Київ 1971, с. 140.

[47] *Архив кн. Ф. А. Куракина*, кн. 1, Санкт-Петербург 1890, с. 51-52.

[48] А. Кочегаров, *Посожский конфликт*; Е. Б. Французова, *Из истории русско-польских отношений в последней трети XVII в. (по материалам межевых комиссий)*, [у:] *Исторические записки*, т. 105, Москва 1980, с. 282-284.

в королевскую сторону ... также и те все волости, которые недавно козаки за Сожою заехали в сторону его королевского величества належати и отданы быти имеють»[49].

Тым не менш, нягледзячы на тое, што казакі атрымалі загад ад царскіх улад вызваліць засожскія землі, яны не жадалі добраахвотна вызваляць гэтыя тэрыторыі, і спрэчкі з-за іх цягнуліся ўсю другую палову 1686 г.[50] Толькі пад націскам рускага ўрада казакі вызвалілі засожскія валасці.

Усталяваўшыся на поўдні Мсціслаўскага ваяводства рубеж з Рускім царствам па выніках Вечнага міру 1686 г. заставаўся адносна стабільным да першага падзелу Рэчы Паспалітай, хаця спрэчныя моманты час ад часу тут узнікалі.

Рускае царства і на пачатку XVIII ст. прытрымлівалася таго кірунку на крычаўска-бранскім памежжы, які быў замацаваны па выніках перамоў 1637 года і фактычна пацверджаны Вечным мірам 1686 г.

Калі ў 1707-1710 гг. рускі генерал-маёр Ф. В. Шыдлоўскі самавольна даў загад уступіць у межы Мсціслаўскага ваяводства, перапісаць там схаваўшыхся расійскіх беглых і далучыў гэтыя землі да бранскіх уладанняў князя Аляксандра Меншыкава (да валасці Красназабар'е) вёскі Зарэчча, Лупішына, Стаінічы, Хмель, Арлоўск, Ціхань, Елавец, Мужычок, Трасцінку, Хоцімск, мястэчка Шумячы, большая частка з якіх і сёння лакалізуецца на ўсходзе Хоцімскага і Клімавіцкага раёнаў, і іншыя не названыя ў крыніцы вёскі паноў Галынскага, Жулкоўскага, Кавінскага (Каміньскага ?), то ўлічваючы патрэбу Расіі ў саюзніку падчас Паўночнай вайны са Швецыяй, гэта выклікала вялікае незадавальненне цара Пятра I і па выніках судовай справы, улічваючы шкоду, якую нанеслі гэтыя дзеянні ва ўзаемаадносіны паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай згодна з заканадаўствам за такія дзеянні магло быць прыменена адносна Ф. В. Шыдлоўскага і смяротнае пакаранне. Аднак, улічваючы былыя баявыя заслугі генерал-маёра Ф. В. Шыдлоўскага, смяротнае пакаранне да яго не была прыменена, ён быў разжалаваны, у яго была канфіскавана маёмасць і да канца жыцця ён быў звольнены з дзяржаўнай службы[51].

На пачатку XVIII ст. правы бераг р. Іпуць ад упадзення ў яе р. Маскоўкі заставаўся за Рускім царствам, пра што сведчыць будаўніцтва тут мястэчка Красназабар'я. Улічваючы, што на плане над цэнтраль-

[49] *Полное собрание законов Российской империи. Собр. 1-е*, т. II: *С 1676 по 1688 гг.*, Санкт-Петербург 1830, с. 776-777.

[50] *Літопис Самовидця...*, с. 142; К. А. Кочегаров, *Посожский конфликт*.

[51] *Письма и бумаги императора Петра Великого*, т. 11: *Выпуск 1 (январь — 12 июля 1711 г.)*, Москва 1962, с. 193, 475-476; *Письма и бумаги императора Петра Великого*, т. 11: *Выпуск 2 (июль — декабрь 1711 г.)*, Москва 1964, с. 29-30.

ным будынкам напісана «дом его светлости», то план быў складзены не раней за 1707 г., калі А. Меншыкаў атрымаў тытул графа і стаў «яго светласцю».

А пра тое, што землі на левабярэжжы р. Іпуць падчас складання плана належалі Рэчы Паспалітай, сведчаць надпісы, якія тычацца прозвішчаў уладальнікаў прылягаючых да мястэчка зямель. Насупраць мястэчка да р. Іпуць прылягалі вёскі паноў Аляксандровіча і шляхціча Панятоўскага, а супраць самога мястэчка былі выкуплены землі ў мсціслаўскага шляхціча Захарыя Ваўчанскага[52].

І надалей на крычаўска-бранскім памежжы Расія, у асноўным, працягвала прытрымлівацца мяжы, што ўсталявалася ў 1637 г. Згодна з памежнымі мапамі 1766 г., на поўдзень ад р. Іпуць Расія праводзіла мяжу па рацэ Маскоўцы, потым па р. Рэкта, далей у р. Беседзь і па такіх маркёрах выстаўляў свае памежныя фарпосты.

У той жа час Рэч Паспалітая лічыла, што мяжа павінна з ракі Маскоўкі ісці на Голае балота. Адтуль яна павінна была паварочваць на ўсход і ісці на вярхоўі р. Беседзь, па якой мяжа павінна спускацца ўніз да ўпадзення ў апошнюю р. Рэкта. Усю гэтую лукавіну р. Беседзь, плошчай больш за 362 валокі, якія належалі в. Арлоўка, Рэч Паспалітая лічыла незаконна захопленай Расіяй тэрыторыяй.

Да в. Арлоўка, згодна з дадзенымі Варшавы, належалі і землі размешчаныя на левым беразе р. Беседзь да ўпадзення ў яе р. Альшанкі агульнай плошчай 104 валок. Але Санкт-Пецярбург выстаўляў свае фарпосты па левым беразе р. Беседзь і, такім чынам, і тут прытрымліваўся размежаванню 1637 г.[53]

Далей на поўдзень, згодна з памежнымі мапамі 1766 г., Санкт-Пецярбург нязначна прасунуў крычаўска-бранскі рубеж на захад у ваваколлях Хоцімска.

Такім чынам, крычаўска-бранскае памежжа, што ўстанавілася ў першай палове XVI ст. у мерыдыяльным міжрэччы рэк Іпуці і Беседзі не даходзіла да р. Іпуць. Калі воласць Крычава і выходзіла да Іпуці паміж вусцямі рэк Хвошня і Надва, то гэта было толькі на самым пачатку XVI ст.

Першапачаткова крычаўска-бранскае памежжа (па замірэнню 1522-1527 гг.) ішло з р. Хвошны на р. Беседзь, з якой зварочвала сухадолам на вярхоўі р. Альшоўкі, з якой выходзіла на р. Вітаву. Але ў другой трэці XVI ст. крычаўска-бранскае памежжа змясцілася вузкай паласой уздоўж правага берага р. Іпуць на ўсход да сучаснай р. Маскоўкі, з выхадам праз апошнюю на вытокі р. Беседзь.

52 РДАСА, ф. 192: Картографический отдел библиотеки МГАМИД, воп. 1: Планы относящиеся к Смоленской губернии, л. 4.

53 AGAD, Zbiór Kartograficzny, teka 509, nr 2, 8.

Па выніках замірэння 1637 г. крычаўска-бранскае памежжа змясцілася на захад ад р. Беседзь да р. Рэкта і лукавіна р. Беседзь заставалася спрэчнай да першага падзелу Рэчы Паспалітай.

Крычаўска-бранскі рубеж пасля інкарпарацыі ўсходніх раёнаў Рэчы Паспалітай у склад Расійскай імперыі стаў рубяжом паміж Рослаўскім уездам Смаленскай губерні і Клімавіцкім уездам Магілёўскай губерні. І сёння ён з нязначнымі змяненнямі, улічваючы былыя прэтэнзіі Рэчы Паспалітай на левабярэжжа Беседзі паўднёвей упадзення ў яе р. Рэкты, якія, верагодна, абапіраліся на гаспадарчыя патрэбы навакольных вёсак, працягвае функцыянаваць у якасці адміністрацыйнай мяжы паміж Хоцімскім і Клімавіцкім раёнамі Магілёўскай вобласці Рэспублікі Беларусь з аднаго боку, і Ершыцкім раёнам Смаленскай вобласці і Клятнянскім раёнам Бранскай вобласці Расійскай Федэрацыі з другога.

У адрозненні ад крычаўскіх рубяжоў мсціслаўска-смаленскі і мсціслаўска-рослаўскі рубяжы не ведалі такой бурнай гісторыі фарміравання, як гэта было на крычаўска-бранскім рубяжы.

Мсціслаўска-смаленскі рубеж устанавіўся па выніках вайны 1512-1522 гг. і практычна праіснаваў без змяненняў да 1919 г. у якасці адміністрацыйнай мяжы Смаленскай і Магілёўскай губерняў. Ён ішоў як гэта апісана ў памежным агранічэнні 1522-1527 гг.: «...из Иваки на Еленский рубеж, да въ Городню, а Городнею въ Вехру въ Чёрной Мохъ, а из Вехры въ Прудилку, а изъ Прудилку въ Железницу, а Железницою подъ Дудено да въ Вехру, а изъ Вехры в Лютую Воду, а изъ Лютой Воды въ Вылино а изъ Вылина на Сожъ ...»[54].

Тут толькі аднойчы падчас перамоў 1522-1527 гг. узніклі праблемы з воласцю Хіславічы, якая арганічна была звязана з Мсціславам, хаця ў перамірных граматах XVI ст. яна заўсёды праходзіць як асобная воласць[55].

Масква патрабавала яе, абгрунтоўваючы тым, што Хіславічы заўсёды належалі Смаленску, у той жа час як паслы ВКЛ сцвярджалі, што Хіславічы заўсёды належалі Мсціславу і ў рэшце рэшт Хіславічы засталіся за ВКЛ[56].

Пасля заключэння «Вечнага міру» з Рускім царствам у 1686 г. мсціслаўска-смаленскі рубеж быў пацверджаны згодна з замірэннем 1522-1527 гг. і хаця яшчэ ў 1691 г. адбыліся сустрэчы паслоў і шляхты абодвух дзяржаў для вырашэння памежных пытанняў, змяненні, якія разглядаліся тады, ужо насілі мясцовы характар і значныя змены

[54] *ДМАМЮ*, с. 67.

[55] *СИРИО*, т. 35, с. 640; *СИРИО*, т. 59, с. 128, 191, 305, 325, 409, 411, 513; *СИРИО*, т. 71, с. 481, 486, 575, 580.

[56] *СИРИО*, т. 35, с. 632, 633, 746.

ў праходжанне дзяржаўнай мяжы не ўносілі. Было разгледжана праходжанне мяжы Мсціслаўскага ваяводства са Смаленскім уездам па р. Гародні на працягу 32 вёрст і прынята рашэнне прадоўжыць працу ў наступным годзе, але на гэтым працы спыніліся[57].

Толькі ў другой палове XVIII ст. тут узніклі спрэчныя пытанні адносна невялікага ўчастка ў раёне Манастыршчыны і Балабанаўшчыны. Зараз згодна з памежнымі мапамі 1766 г. Расія выстаўляла свае фарпосты ў міжрэччы Віхры і Жалезніцы, апускаючыся да рэчак Прудаўка і Лютня, дзе ёю былі забраны 187 валок зямлі ў маетнасці Манастыршчына і 66 валок у маетнасці Балабанаўшчына[58].

Мсціслаўска-рослаўскі рубеж таксама ўстанавіўся пасля вайны 1512-1522 гг. і ён таксама апісаны ў памежным разгранічэнні 1522-1527 гг.: «... а Сожомъ на низъ въ Березыню, а Березынёю вверхъ сухомъ промеж сёл Почина и Гладковичъ, по Холмомъ, а оттол к Пулневу»[59].

Такім чынам мяжа з р. Сож паварочвала ў яго левы прыток р. Бярэзіну, якой падымалася ўверх. З вярхоўяў р. Бярэзіна мяжа ішла ў накірунку р. Асцёр — «вверхъ сухомъ промеж сёл Почина и Гладковичъ, по Холмомъ, а оттол к Пулневу». Згодна з апісаннем, мяжа праходзіла паміж сёламі «Гладковичи» і «Почина». Апошні, гэта сучасная в. Пачынічы Шумяцкага раёна Смаленскай вобласці.

Далей на поўдзень рослаўска-мсціслаўскі рубеж у крыніцы апісваецца так: «промежи Словнева да Шибнева к Гневкову Доброю рекою в Водонос, от Водоноса Доброю рекою у Востръ через Великий Бор у речку Шумячу...»[60].

Гэты ўчастак парубежжа на XVI ст. добра апрацаваны Н. Б. Шеламанавай і за Астром яго ўдакладніў В. М. Цемушаў. Яно даволі добра лакалізуецца і амаль дакладна адпавядае адміністрацыйнай мяжы XIX — пачатку XX ст. паміж Смаленскай і Магілёўскай губернямі Расійскай імперыі.

Далей з р. Шумячы мяжа ішла ў р. Стрэкула, дзе заканчваўся мсціслаўска-рослаўскі і пачынаўся крычаўска-рослаўскі адрэзак дзяржаўнай мяжы, які з р. Шумячы вядзе ў р. Нямыліцу (суч. рака Неміліца), а аддуль «старымъ рубежомъ къ Заборью въ Ипуть»[61].

[57] *Полное собрание законов Российской империи. Собр. 1-е*, т. III: *1689-1699*, Санкт-Петербург 1830, с. 119-12 1.

[58] AGAD, Zbiór Kartograficzny, teka 509, nr 2, 8.

[59] *ДМАМЮ*, с. 67.

[60] Там жа.

[61] Там жа.

Але ў другой палове XVIII ст. крыніцы фіксуюць спрэчныя ўчасткі дзяржаўнай мяжы як на мсціслаўска-рослаўскім, так і на крычаўска-рослаўскім рубяжы.

Спрэчкі былі адносна зямель, размешчаных паміж вытокамі р. Бярэзіна і плынню Астра. У вытоках р. Бярэзіна Расія выстаўляла свае фарпосты не па Бярэзіне, як гэта лічылася раней, а па яе левым прытоку р. Арысце (зараз р. Гарыста[62]), у выніку чаго ад маёмасці Мыш (Пажога) было забрана 65 валок зямлі.

Паўднёвей вытокаў р. Бярэзіна старая мяжа ішла р. Ліндарфкай (зараз Ліндыхаўка[63]) у р. Цераблінку, потым рэчкай Шыбнеўкай у Ржавае і Гарэлае балота, а з апошняга рэчкай Дубенкай у р. Асцёр.

Але і тут зараз Расія выстаўляла свае фарпосты на захад ад гэтых памежных маркераў, у выніку чаго ў Бабыліцкім старастве было забрана 146 валок зямлі, а ад маёмасці Ажогі — 15 валок зямлі[64].

На поўдзень ад Астра і на ўсход ад р. Шумячы ў 1766 г. Расія забрала ў маёмасці Шумячы Вялікі бор агульнай плошчай 85 валок. На поўдзень ад Вялікага бору таксама адбыліся змены ў праходжанні мяжы не на карысць Рэчы Паспалітай. Калі раней мяжа ішла Чорным руччом ад места яго ўпадзення ў р. Гразнулічку наўпрост у накірунку в. Краснаполле, то зараз мяжа змясцілася на захад і рускія памежныя фарпосты стаялі ўздоўж Вялікага балота, якое было па правым беразе р. Шумяча і, такім чынам, ад маетнасці Панятоўка было забрана больш за 72 валокі зямлі.

Усяго згодна з памежнымі спрэчкамі 1766 г. Рэч Паспалітая лічыла, што Расія незаконна трымае больш за 1948 валок зямлі на мсціслаўскім рубяжы[65]. І такая сітуацыя на памежжы заставалася да 1772 года, калі пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай былая дзяржаўная мяжа паміж Рэччу Паспалітай і Расійскай імперыяй уздоўж мсціслаўскага рубяжа была рэарганізавана ў адміністрацыйную мяжу Магілёўскай губерні са Смаленскай і Чарнігаўскай губернямі.

jąca się na co dzień językiem białoruskim, utożsamiała się z polską racją stanu[82]. Trwający konflikt sprzyjał polaryzacji stanowisk, co przekładało się na wzrost świadomości narodowej kresowych Polaków[83]. Przytłaczająca większość społeczności katolickiej podzielała wizję dziejów i świata reprezentowaną przez Rzeczpospolitą. Na zachodniej Białorusi czas wojny (okupacja sowiecka, a potem niemiecka) znacząco przyczynił się do uzyskania przez tę grupę polskiej tożsamości narodowej.

Polskie podziemie aktywnie zwalczało kolaborujące środowiska białoruskie. Jeżeli zachodziła taka potrzeba, uciekano się do denuncjowania Niemcom narodowych działaczy białoruskich jako współpracowników sowieckiej partyzantki. W kierowanym do obywateli przekazie starano się podkreślać przynależność ziem białoruskich (zwłaszcza jej zachodniej części) do państwa polskiego, czego najlepszym przykładem miały być historyczne wpływy na tym obszarze kultury łacińskiej. W tym ujęciu białoruskość traktowana była jako jeden z elementów bogatego dziedzictwa Rzeczypospolitej.

Do podobnego sporu, jak ze środowiskami nacjonalistycznymi, dochodziło również pomiędzy polskim podziemiem zbrojnym a partyzantką sowiecką[84]. Narastające napięcie w pełni wybuchło po zerwaniu w kwietniu 1943 roku międzypaństwowych stosunków pomiędzy Związkiem Sowieckim a polskim rządem na emigracji[85]. Tolerujące się do tej pory nawzajem siły militarne — partyzanci sowieccy i Armia Krajowa, przeszły w stan otwartej wojny[86]. Dochodziło do starć zbrojnych. Od połowy 1943 roku oddziały partyzantki sowieckiej przystąpiły do aktywnej likwidacji polskiego podziemia[87]. Kwestionowano jakiekolwiek prawa państwa polskiego do ziem białoruskich. Wskazywano na wielowiekowe związki łączące Białorusinów i Rosjan, których uwieńczeniem było funkcjonowanie w ramach wspólnego państwa — Związku Sowieckiego.

Narastający konflikt polsko-sowiecki starały się dodatkowo podsycić władze niemieckie. W wydawnictwach propagandowych kierowanych głównie z myślą o białoruskojęzycznych wyznawcach Kościoła katolickiego, czyli pisanych po białorusku, ale czcionką łacińską, budowano prze-

[82] NARB, f. 63, o. 16, d. 24, k. 1.

[83] I. Kabzińska, *Wśród „kościelnych Polaków". Wyznaczniki tożsamości etnicznej (narodowej) Polaków na Białorusi*, Warszawa 1999, s. 122.

[84] Zob. więcej: Z. Boradyn, *Niemen — rzeka niezgody. Polsko-sowiecka wojna partyzancka na Nowogródczyźnie 1943-1944*, Warszawa 1999.

[85] T. Gawin, *O bycie Polakiem. Polacy w Białoruskiej Socjalistycznej Republice Sowieckiej 1944-1991*, Grodno — Białystok 2013, s. 143-144.

[86] M. Бартушка, *Партызанская вайна ў Беларусі ў 1941-1944 гадах*, „Arche", 2010, nr 5, s. 325-337.

[87] M. Gnatowski, *Białostockie Zgrupowanie Partyzanckie*, s. 190.

kaz mający pogłębić i tak istniejącą historyczną i polityczną przepaść pomiędzy Polakami a Rosjanami (teraz nazywanymi komunistami). Perfidie działań rosyjskich starano się ukazać poprzez demaskowanie zbrodni komunistycznych. Dogodną okazją wzmocnienia tego typu przekazu stało się odkrycie przez Niemców w Katyniu grobów polskich oficerów. W artykule zamieszczonym na łamach kalendarza przygotowanego na rok 1944, w tekście w języku białoruskim pisanym łacinką, nie pozostawiano najmniejszych złudzeń co do zbrodniczego charakteru systemu komunistycznego. Teksty o podobnej treści zamieszczane były też na łamach współpracującej z Niemcami prasy białoruskiej[88]. W opinii władz niemieckich wina NKWD była niepodważalna[89]. Strasząc możliwością powrotu systemu sowieckiego, starano się jak najmocniej pobudzić nastroje antysowieckie.

Pomimo trwającego konfliktu polsko-sowieckiego miejscowych Polaków starała się pozyskać również strona sowiecka. W odezwach zatytułowanych „Obywatele Białorusi i Polacy" zachęcano do wspólnej walki przeciwko nazistowskiemu okupantowi[90]. Liczono, iż wspólny wróg skutecznie niwelować będzie wszelkie narosłe różnice, także te z lat okupacji sowieckiej 1939-1941 pomiędzy władzą komunistyczną a społecznością polską. Starano się także osłabiać niemiecki przekaz o Katyniu, zastępując go własną wizją wydarzeń. W tekście zamieszczonym na łamach „Prawdy" (27 marca 1944 r.), a następnie przedrukowanym w lokalnej prasie partyzanckiej, cytowano słowa Andrzeja Witosa, który zachęcał żołnierzy świeżo sformowanej przy Armii Czerwonej polskiej 3. Dywizji do walki z Niemcami, m.in. w celu pomszczenia zbrodni dokonanych przez nich w Katyniu[91].

Starano się w konstruowanych odezwach przemilczać konflikty z przeszłości i tworzyć wizję możliwej współpracy w przyszłości. Historycznymi bohaterami, do których chętnie się odwoływano byli patroni polskich oddziałów tworzonych przy Armii Czerwonej — Tadeusz Kościuszko i Romuald Traugutt. W nowej, rysującej się sytuacji politycznej uosabiać mieli oni wszystkie najlepsze cechy, łącząc miłość do ojczyzny i potrzebę przeprowadzenia zmian społecznych. W odezwach kierowanych do Polaków inaczej niż do Białorusinów znacznie rzadziej odwoływano się do idei komunistycznej i osoby Stalina. Natomiast chętniej używano słów patriotyzm i demokracja. W czasie odbywających się w Moskwie 24 marca 1944 roku uroczystości z okazji rocznicy wybuchu powstania kościuszkowskiego pisano, iż „podobnie jak w czasach Kościuszki, także obecnie miejsce Polski

[88] „Biełaruski hołas", 6 VIII 1943, nr 31.
[89] PAOG, f. 1817, o. NOB. Kalendar 1944, s. 29-30.
[90] Tamże, sygn. f. 758, o. 1, d. 4, k. 8.
[91] „Белостокская правда", 31 III 1944, nr 34.

jest wśród wolnych narodów", co w aktualnej sytuacji polityczno-militarnej oznaczać miało bliski sojusz ze Związkiem Sowieckim[92]. Stosując te same schematy, podobnie konstruowano przekaz, w którym powoływano się na Traugutta, informując, iż „rząd carski okrutnie rozprawiał się z powstańcami. Złamane klęskami, represjami i walką wewnętrzną powstanie już słabło, gdy Traugutt, były oficer saperów armii rosyjskiej, w marcu 1864 roku utworzył ostatni rząd rewolucyjny. Po osiemdziesięciu latach na ziemi Związku Radzieckiego otoczeni przyjazną opieką narodu rosyjskiego, Polacy znów wznoszą sztandar walki o wolność i niepodległość swej ojczyzny, sztandar, w którego obronie zginął Traugutt"[93].

Okres poprzedzający wielką letnią ofensywę Armii Czerwonej 1944 roku charakteryzował się na Białorusi chaosem politycznym. Na obszarze ziem białoruskich walczyli nie tylko Niemcy ze Związkiem Sowieckim, ale swoje interesy polityczne chcieli także wygrać Polacy i Białorusini. Główny bój o wizję dziejów w latach 1941-1944 rozegrał się pomiędzy przekazem historycznym środowisk narodowo-nacjonalistycznych, reprezentowanym przez białoruskich działaczy kolaborujących z Niemcami a dziejami sowieckiej Białorusi, których współczesnym reprezentantem były sowieckie oddziały partyzanckie. Na tle tego sporu wyraźnie zmarginalizowany został przekaz polski. Trwający konflikt ostatecznie rozstrzygnęło militarne zwycięstwo Armii Czerwonej nad Wehrmachtem. Zdecydowało ono o faktycznej, politycznej przyszłości tych ziem, których częścią był sowiecki przekaz dziejów.

Narodowa koncepcja przeszłości Białorusi została przez władze sowieckie całkowicie odrzucona. Podjęcie przez środowiska białoruskie współpracy z Niemcami, w opinii władz sowieckich, ostatecznie ją kompromitowało. Oskarżenie o kolaborację było wystarczającym zarzutem wykluczającym jakąkolwiek merytoryczną dyskusję. Możliwości wszelkiej działalności pozbawiona została również białoruska elita narodowa propagująca alternatywną w stosunku do sowieckiej wizję historii ziem białoruskich — albo ewakuowała się ona z armią niemiecką na zachód, albo została poddana represjom przez system sowiecki. W 1944 roku jedyną szansę na budowę namiastki białoruskiej państwowości stwarzał Związek Sowiecki. Na poziomie przekazu historycznego oznaczać to miało powrót do komunistycznej wersji historii propagowanej przed wybuchem wojny. Podobnie jak nazistowski opis świata, także traktowana na równi z nim narodowo-białoruska wizja przeszłości została potępiona i ulec miała całkowitemu zapomnieniu. Lata II wojny światowej i zwycięska walka komunizmu

[92] Tamże, 3 IV 1944, nr 35.
[93] Tamże, 31 III 1944, nr 34.

z nazizmem, w opinii działaczy komunistycznych, ostatecznie udowodniła wyższość systemu sowieckiego i głoszonego w jego ramach przekazu historycznego.

Summary

Creating a historical account of events in Belarusian territories in the period of the Soviet-German War (1941-1944)

The main conflict in the struggle for a vision of historical events in the years 1941-1944 unfolded between historical accounts presented by national milieus, represented by Belarusian activists collaborating with the Germans, and those provided by Soviet Belarus, represented by Soviet partisan units. Against a background of this conflict, the Polish perspective was visibly rejected. The on-going conflict was finally resolved by the military victory of the Red Army over the Wehrmacht. The national concept of Belarus' past was completely rejected by the Soviet authorities. In their opinion, the fact that Belarusian milieus had collaborated with the Germans, definitively discredited them. An accusation of collaboration was a sufficient objection that ruled out any substantive debate. In 1944 only the Soviet Union offered a chance to build what was the closest thing to Belarusian statehood. In historiographical terms, this meant going back to the communist version of history propagated before the outbreak of the war. Just like the Nazi description of the world, the national-Belarusian vision of the past was treated on a par with the Nazi description of the world, and as such was condemned and was to be forgotten for ever.

Змест

Канструяванне гістарычнага пераказу на беларускіх землях у перыяд нямецка-савецкай вайны (1941-1944)

Галоўнае змаганне за вобраз мінулага ў 1941-1946 гадах разыгралася паміж гістарычным пераказам нацыянальна-нацыяналістычных асяроддзяў, рэпрэзентаваных беларускімі дзеячамі, якія супрацоўнічалі з немцамі, і гісторыяй савецкай Беларусі, якой сучасным прадстаўніком былі савецкія партызанскія атрады. На фоне гэтага супрацьстаяння польскі пераказ быў адсунуты на другі план. Працяглы канфлікт канчаткова вырашыла ваенная перамога Чырвонай Арміі над Вермахтам. Нацыянальная канцэпцыя будучыні Беларусі была поўнасцю адхілена савецкай уладай. Супрацоўніцтва беларускіх асяроддзяў, на думку савецкіх улад, канчаткова іх скампраметавала. Абвінавачанне ў калабарацыянізме было дастатковай прычынай, каб выключыць якую-небудзь з імі дыскусію. У 1944 г. адзіны шанс на будову заменніка беларускай дзяржаўнасці ствараў Савецкі Саюз. На ўзроўні гістарычнага пераказу мела гэта абазначаць вяртанне да камуністычнай версіі гісторыі, прапагандаванай да пачатку вайны. Падобным чынам як нацысцкае апісанне свету, таксама і трактаванае нараўне з ім нацыянальна-беларускае бачанне будучыні было асуджана і прыгаворана да поўнага забыцця.

Wojciech Śleszyński — dr hab., prof. Uniwersytetu w Białymstoku, pracownik naukowy Wydziału Historyczno-Socjologicznego Uniwersytetu w Białymstoku.

Анатоль Трафімчык
(Мінск)

Шэраговы „светлай будучыні”, або Першы палітычны актывіст Круговіч: Станіслаў Купайчык *(спроба біяграфічнага нарысу)*

ХХ стагоддзе не толькі масава абудзіла нацыянальную свядомасць, але і абвастрыла палітызаванасць насельніцтва. І калі ў ранейшых часах мы не маем якіх-небудзь звестак пра выяўленне грамадзянскай пазіцыі каго-небудзь з шэраговых жыхароў Круговіцкай воласці Слуцкага павета Мінскай губерні, дык па наступленні глабальных сацыяльных катаклізмаў — перш за ўсё Першай сусветнай вайны і рэвалюцый 1917 г. — з гушчы сялянства на палітычную арэну рэгулярна выходзяць індывіды і названая мясцовасць не стала выключэннем.

Ці не самым першым такім актывістам з'яўляецца кругавец Станіслаў Купайчык. Звестак пра гэтага чалавека знайшлося не так і шмат. Аднак і на аснове наяўных можна аднавіць галоўныя старонкі яго біяграфіі, стварыць грамадзянскі партрэт.

За царом

Дзякуючы створанай польскімі навукоўцамі базе асоб даведваемся, што С. Купайчык нарадзіўся ў 1888 г. У той даведцы яго паходжанне абазначанае інтэлігенцкім, а нацыянальнасць — польскай[1]. Аднак варта падкарэкціраваць гэту інфармацыю. Станіслаў нарадзіўся ў сям'і рамеснікаў (у прыватнасці ён і сам займаўся шавецкай справай — шыў боты[2], а прафесія ў той час нярэдка пераходзіла з пакалення ў пакаленне). Дый рамеснікі ў нашай мясцовасці недалёка адышлі ад сялянскай працы, часта маючы зямельны надзел і працуючы на ім. Таму паходжанне С. Купайчыка лепей лічыць сялянска-пралетарскім — найлепшым паводле марксісцка-ленінскай сістэмы каштоўнасцей. Наконт нацыянальнасці таксама трэба заўважыць, што хоць і адносілі сябе Купайчыкі да палякаў, хутчэй за ўсё яны з'яўляліся спаланізаванымі беларусамі. Атаясамленне з польскай нацыянальнасцю часта

[1] M. Gnatowski, *Zgromadzenie Ludowe Zachodniej Białorusi: fakty, oceny, dokumenty,* Białystok 2001, s. 312.

[2] Менавіта шаўцом назваў яго паліцыянт у 1922 г., што зафіксавана ў скарзе дэпутата Сейма Антона Кардоўскага: Archiwum Akt Nowych (далей: AAN), Prezydium Rady Ministrów, sygn. 4457/23, k. 6. Гл. падрабязней далей.

адбывалася на падставе вызнаванага каталіцызму. Само прозвішча характэрна больш для Беларусі, чым Польшчы (хоць і ў апошняй сустракаецца). Да таго ж яно мае сацыяльную канатацыю прасталюдзіна, а ніяк не шляхты (у адваротным выпадку можна было б залічыць носьбіта такога прозвішча ў спаланізаваную шляхецкую праслойку). Зрэшты, расставіць кропкі над „і" дапамогуць дадатковыя росшукі ў архівах.

Наступная па храналогіі звестка стасоўна постаці С. Купайчыка ўсплывае ў кантэксце інфармацыі пра Першую сусветную вайну. Станіслаў Купайчык, сын Францішка, фігуруе ў спісе Польскага камітэта ўцекачоў, якія асталяваліся на час вайны ў Ніжагародскай губерні[3]. У дадзеным выпадку таксама вылучаем гіпотэзу. Супраць яе выступае той факт, што расійска-германскі фронт у 1915 г. да Круговіч не дайшоў, а значыць, не было і масавых уцёкаў сялянства на ўсход. Аднак існуе аргумент на карысць ідэнтыфікацыі Станіслава Францавіча Купайчыка ў якасці жыхара вёскі Вялікія Круговічы. Фронт усё-такі наблізіўся да меж гміны і некаторыя жыхары маглі падацца на ўсход — у страху вочы вялікія. Тым больш, што ўцёкам спрыяла расійская палітыка, падтрымліваючы вобраз пачвары-германца і часам ледзь не сілком выганяючы тубыльцаў з іх котлішчаў. Да таго ж нямецкая армія наступала вельмі імкліва, і ўвосень 1915 г. пры наступленні немцаў не было ясна, дзе яны ўрэшце спыняцца. Балазе менавіта праз Круговічы ляжаў адзін са значных шляхоў нашых землякоў па Берасцейска-Пінскім Палессі на ўсход — дарогаю Ганцавічы — Круговічы — Будча — Чудзін — Старобін, хоць яе стан жадаў лепшага. Па вялікім рахунку С. Купайчык у параўнанні з большасцю аднавяскоўцаў да зямлі быў прывязаны найменш — дзякуючы свайму галоўнаму прафесійнаму занятку і — адпаведна — сацыяльнаму статусу. Сялян-хлебаробаў карміла найперш асабістая зямля, пакінуць якую (яшчэ ў тыя патрыярхальныя часы!) азначала паставіць пад пытанне ўвогуле сваё існаванне і сваіх сямейнікаў. Рамеснікі ж маглі пракарміцца працаю „па спецыяльнасці" паўсюль, дзе існаваў попыт у іх прадукцыі. Натуральна, вынікі шавецкай справы, навыкамі якой валодаў С. Купайчык, не маглі не быць запатрабаваны ў глыбі Расіі. З азначанай прычыны гэтаму кругаўцу менш турботна было пакідаць родны кут.

Менавіта бежанствам можна абумовіць развіццё палітычных поглядаў С. Купайчыка. Тым часам у Расіі ўсё большую папулярнасць

[3] *Беженцы Первой мировой войны в Нижегородской губернии*, Партал „Беженцы Первой Мировой", [Дата доступу: 13.01.2015], http://bezhentsy-pmv.com/polskkom_k.php.

у народных масах заваёўвалі бальшавіцкія ідэі. Галоўнымі былі антываенныя лозунгі і заклікі перадаць зямлю сялянам. Зразумела, яны ахоплівалі шырокія масы, і сімпатыкаў сацыялістаў увачавідкі станавілася больш і больш. Па вяртанні ў заходнебеларускі родны кут, які апынуўся ў складзе адроджанай Польшчы паводле Рыжскага міру (1921), многія прывозілі з сабою „бацылу камунізму". Так і С. Купайчык мог прыехаць дадому прыхільнікам сацыялістычнага ладу. Больш за тое, у пачатку 1920-х гг. кругавец усплывае як адзін з мясцовых актывістаў.

Пад Польшчай

Адбылося гэта падчас выбараў 1922 г. у Сейм Польскай Рэспублікі. С. Купайчык вылучаўся кандыдатам у акруговым спісе Польскай сялянскай партыі „Вызваленне"[4] пад № 4 акругі № 60 „Пінск" пасля абранага ў выніку дэпутатам Антона Кардоўскага (журналіста з Варшавы), Эдмунда Вайнароўскага (адваката з Пінска), Яна Музыкі (селяніна калоніі Залавішча з павета Сарны) з усіх 10 вылучэнцаў[5]. Гэта была вельмі высокая пазіцыя, якая, тым не менш, не дазволіла прабіцца ў парламент нікому з названых, акрамя першага. Сімптаматычна, што сярод кандыдатаў на выбарах С. Купайчык не быў адзіным прадстаўніком з Круговіцкай гміны Лунінецкага павета Палескага ваяводства (пры Польшчы настаў іншы адміністрацыйны падзел). Акрамя жыхара Вялікіх Круговіч у дэпутаты вылучаўся 28-гадовы селянін Ян Кучынскі з засценка Кругліца. Гэта ўказвае і на індывідуальную актыўнасць жыхароў гміны, і на папулярнасць ПСП „Вызвалення" сярод мясцовага насельніцтва (значны ўплыў блізкіх па поглядах бальшавікоў і эсэраў на жыхароў Круговіцкай гміны быў адзначаны палякамі яшчэ падчас іх першай акупацыі беларускіх зямель[6]). Прынамсі кандыдатаў з шэрагаў названай палітычнай арганізацыі ў іншых пяці гмінах Лунінецкага павета не знайшлося.

Выбары не прайшлі гладка. Польская ўлада стасоўна беларусаў ставілася як да людзей ніжэйшага гатунку. Узнікалі інцыдэнты. Некато-

[4] Польская народная партыя (ПСП) „Вызваленне" (Polskie Stronnictwo Ludowe „Wyzwolenie", 1915-1931) — сялянская левая палітычная партыя ў міжваеннай Польшчы, створана ў 1915 г. Галоўныя мэты: народная ўлада, свецкая дзяржава, усеагульная і бясплатная адукацыя, радыкальная зямельная рэформа. ПСП цесна супрацоўнічала з Польскай сацыялістычнай партыяй. ПСП улілася ў Народную партыю (Stronnictwo Ludowe).

[5] Dziennik Urzędowy Województwa Poleskiego, 1922, 27 paźdz., nr 10, s. 3.

[6] 1920, maj 10, Baranowicze. Raport z powiatu baranowickiego Straży Kresowej za okres od 15 kwietnia do 10 maja 1920, [w:] *O niepodległą i granice. Raporty Straży Kresowej 1919-1920 Ziem Północno-Wschodnich opisane*, Warszawa — Pułtusk 2011, s. 973-976.

рыя з іх задукаментаваны дзякуючы таму, што „левыя" ўсё ж змаглі аформіць сваю прысутнасць ва ўладных структурах.

Адзін з эксцэсаў адбыўся пры ўдзеле С. Купайчыка. Напярэдадні выбараў, якія праходзілі 5 лістапада, на пасяджэнні акруговай выбарчай камісіі № 18 Лунінецкага павета ў Круговічах, што праводзілася 16 кастрычніка, камендант мясцовага пастарунка Камінскі ў прысутнасці члена той жа камісіі Антона Германа (не выключана, што Гурмана, бо менавіта гэта прозвішча распаўсюджана ў Вялікіх і Малых Круговічах. — *А. Т.*) і іншых заявіў: „Што тому сляпому шаўцу Купайчыку трэба? Я за яго вазьмуся па заканчэнні выбараў". Магчыма, гэты факт прайшоў бы міма ўвагі высокіх інстанцый, але паліцэйскі настолькі распеpaзаўся, што 10 лістапада, г. зн. па выбарах, каля гміннага будынка ў Круговічах, трымаючы ў руцэ на ўзводзе рэвальвер, наляцеў на таварыства кругаўцоў з крыкам „Маўчаць, бандыты! Я вас застрэлю!". Пасля гэтага аднаго з прысутных — Спірыдона Аскерку — ударыў некалькі разоў рэвальверам па галаве. Відаць, галоўнай прычынай стала тое, што кругавец, як сказана ў крыніцы, размаўляў са сваімі таварышамі пра праграму ПСП „Вызваленне" і пра выбары ў Сейм і Сенат. Па выніках інцыдэнту абраны дэпутатам на тых выбарах А. Кардоўскі склаў інтэрпеляцыю — скаргу-запыт у вышэйшыя дзяржаўныя інстанцыі, у дадзеным выпадку — у адрас міністра ўнутраных спраў[7]. У дакуменце і апісаны падзеі з удзелам С. Купайчыка і мясцовага паліцэйскага.

Невядома, ці дамагліся кругаўцы сатысфакцыі. Сумнеўна. У далейшым улада ўзмацніла ціск і падобныя захады пайшлі на змяншэнне.

Прозвішча С. Купайчыка з нам вядомых дакументаў знікае. Неўзабаве — у 1931 г. — і яго палітычная арганізацыя — ПСП „Вызваленне" — раствараецца ў блізкай па поглядах Сялянскай партыі. Але яшчэ за восем гадоў да гэтага ўзнікла Камуністычная партыя Заходняй Беларусі — як філія польскіх камуністаў. Таму С. Купайчык набыў новы партыйны білет недзе паміж 1923 і 1931 гг. Паколькі сярод камуністычных дыверсантаў, якія праводзілі тэрарыстычную дзейнасць да 1925 г. — часу ўтварэння першай ячэйкі КПЗБ на тэрыторыі Круговіцкай гміны — у мястэчку Ганцавічы[8], ён таксама не быў заўважаны, дык тут варта схіляцца да меркавання, што кругавец стаў камуністам у другой палове 1920-х гг.

Недзе каля 1930 г. С. Купайчык ажаніўся. Яму ўжо хутчэй за ўсё пераваліла за 40. Узяў замуж нашмат маладзейшую дзяўчыну — Марыю, дачку Адольфа, 1903 г. нар. Мяркуючы па тагачаснай культуры

[7] AAN, Prezydium Rady Ministrów, sygn. 4457/23, k. 6.

[8] *Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Ганцавіцкага р-на*, Мінск 1999, с. 114.

(да таго ж у каталіцкім асяродку), калі разводы не былі прыняты, шлюб для абодвух стаў першым.

Да пачатку 1930-х гг. С. Купайчык паспеў не толькі выявіць сваю камуністычную актыўнасць, але і выйсці за рамкі закона (больш канкрэтнай інфармацыяй не валодаем). Такую ацэнку даў польскі суд, пакараўшы кругаўца чатырма гадамі зняволення. Магчыма, арышт С. Купайчыка звязаны з кантэкстам разгрому Ганцавіцкага раённага камітэта КПЗБ напрыканцы 1930 г., у выніку чаго быў асуджаны таксама на чатыры гады кіраўнік ячэйкі Навум Шмуклер[9].

Выйшаў на свабоду С. Купайчык толькі ў лютым 1936 г. Такія звесткі пачэрпнуты ў справаздачах сілавых органаў, якія назіралі за сем'ямі палітычных вязняў. Прычым, як высачыла паліцыя, кіраўніцтва КПЗБ матэрыяльна дапамагала сваім дзеячам на месцах, а калі член партыі трапляў за краты, то не пакідала ў бядзе яго сям'ю. Таму жонка С. Купайчыка — Марыя Адольфаўна — таксама мела час ад часу грашовыя пераводы з Варшавы ў памеры 15-20 злотых[10].

Як праявіў сябе кругавец на палітычнай ніве ў наступныя пару гадоў, застаецца пакуль невядомым. Хіба не заставаўся ў баку ад падзей і настрояў, якія з боку паліцыі спарадзілі маркіраванне Круговіцкай гміны камуністычным агменем[11].

Аднак у 1938 г. гэтага бальшавіцкага актывіста напаткала непрыемная нечаканка — Крэмль распусціў КПЗБ. Чалавек застаўся беспартыйным, а гэта значыць, што і без даходаў. Не выключана, што давялося заняцца працай па сваёй намінальнай прафесіі — шыццём ботаў.

Пры „першых саветах”

1939 г. азначаў спаўненне надзей С. Купайчыка. 17 верасня Чырвоная Армія перайшла савецка-польскую мяжу і ўзяла пад свой кантроль тэрыторыю Заходняй Беларусі, нават крыху больш — залезшы на этнічна польскія землі. Круговіцкая гміна знаходзілася паблізу мяжы. Таму літаральна за пару сутак яе вёскі апанавала новая ўлада. Такія радыкальныя змены азначалі, з аднаго боку, узвышэнне людзей, якія канфрантавалі з папярэдняй уладай, а з іншага боку — стваралі пагрозу жыццю прадстаўнікоў старой улады. У некаторых месцах Заходняй Беларусі даходзіла нават да людабойства.

[9] Там жа, с. 115.

[10] AAN, Zespół „Komenda Wojewódzka Policji Państwowej w Brześciu”, sygn. 2018/13, k. 97-98, 160-161.

[11] AAN, Zespół „Komenda Wojewódzka Policji Państwowej w Brześciu”, sygn. 2018/2, k. 11-12.

Вясковыя жыхары сустракалі новыя ўлады святочным чынам: у лепшым адзенні і з кветкамі. Праўда, тая акцыя — перш за ўсё ўсталяванне брамы для вітання новай улады — была тады тыповай для заходнебеларускіх вёсак, што наводзіць на думку пра яе інспіраванне з усходу (ну, не маглі ж вяскоўцы ад Палесся да Віленшчыны згаварыцца, як адзін, і паставіць спектакль па адным сцэнарыі!). У многім заснаваны на рэчаіснасці і раскручаны савецкай прапагандай склаўся катэгарычны стэрэатып, што „заходнікі" сустракалі перамены верасня 1939 г. цалкам зычліва. Але і перабольшваць станоўчыя эмоцыі ад падзей (у прыватнасці кругаўцоў) не варта. Некаторым бачыліся адваротныя карціны. Паслухаем карэннага кругаўца Мікалая Блінкоўскага: „У месяцы кастрычніку 1939 г. ад самага нараджэння я жыў у вёсцы Вялікія Круговічы Лунінецкага павета. Праз некалькі дзён пасля пераходу мяжы Польшчы войскамі савецкімі з'явіліся ў нас прадстаўнікі НКВД. Мясцовае насельніцтва не аказвала наогул ніякай радасці, але знайшлося некалькі такіх, якія мелі з часоў да верасня 1939 г. кепскую характарыстыку, яны віталі тых саветаў нават збудаванай трыумфальнай брамай, у далейшым праявіўшы вялікую актыўнасць у знішчэнні ўсялякага польскага даробку. Праводзілі часта праверкі, забіралі ў заможнейшых гаспадароў і ўладальнікаў маёнткаў збожжа, скаціну, адзежу, мэблю, жыўнасць і ўсё, што ўяўляла пэўную вартасць. Пры тых выпадках хвалілі новы лад, поўны дабрадзействаў, і ганілі ўсё тое, што мела нейкую сувязь з Польшчаю, акрамя таго, распаўсюджвалі нагаворы і данясенні альбо самі былі выканаўцамі мучэнняў, арыштаў ці збівання, як гэта мела месца з уладальніцай-удавой старога веку маёнтка Агарэвічы Свяжынскай, якая ішла пешкі і была пабітая, падверглася жорсткаму абыходжанню па дарозе на станцыю Ганцавічы, якая ляжыць за 7 км, і ў другім выпадку — з сынам"[12]. Як дэманструюць далейшыя словы М. Блінкоўскага, яго меркаванні распаўсюджваюцца і на круговіцкіх бальшавіцкіх актывістаў.

На першых ролях у мясцовых інцыдэнтах быў С. Купайчык і яго хаўруснікі-аднадумцы. Перш за ўсё яны накінуліся на сваіх нядаўніх прыгнятальнікаў і крыўдзіцеляў — паліцэйскіх. Ахвярай стаў паліцыянт круговіцкага пастарунка з нетутэйшым прозвішчам Кашковяк. Паводле ўспамінаў вывезенага на Поўнач у лютым 1940 г. М. Блінкоўскага, названага прадстаўніка польскіх сілавых органаў, які толькі-толькі вярнуўся з няўдалай для Польшчы ваеннай кампаніі (супраць немцаў ці саветаў ён ваяваў, не ўстаноўлена), падверглі зневажанню і групавому збіццю наступныя жыхары іх вёскі: Купайчык Станіслаў,

[12] Archiwum Wschodnie przy Ośrodku „Karta" w Warszawie (далей: AW), sygn. 132/162, nr 3310 Blinkowski Mikołaj, k. 76.

асуджаны да турмы польскім судом за працу на карысць саветаў, Гайцюкевіч Адам, Герман Антон, Герман Вацлаў, Занька Васіль, Занька Мікалай, Заяц Андрэй[13] (апошні вясной 1940 г. спачатку ўзначаліць круговіцкі калгас, а ў снежні таго ж года — Круговіцкі сельскі савет). Не адмаўляючы фактару стыхійнасці ў дзеяннях групы названых кругаўцоў, неабходна адцеміць, што яны маглі ўжо дзейнічаць згодна з новай юрыспрудэнцыяй, паводле якой яшчэ з 19 верасня на занятых Чырвонай Арміяй тэрыторыях сталі арганізоўвацца Часовыя ўпраўленні, а з 21 верасня — атрады народнай міліцыі з далучэннем да тых органаў мясцовых жыхароў (пад камандаваннем, аднак, „усходнікаў"). Па ўсёй верагоднасці, названы шэраг актывістаў і стаў ядром для стварэння структур новай улады, рашэнні якіх па першым часе сталі галоўным законам сярод насельніцтва Заходняй Беларусі.

„На момант прыходу Чырвонай Арміі яна да беларускага насельніцтва адносілася прыхільна, а да польскай нацыянальнасці і да ураднікаў — варожа. Усе службоўцы былі звольнены са сваіх пасад, а іх месцы занялі крымінальнікі і палітычныя вязні, галоўным начальнікам быў шавец з прозвішчам Куфайчык (напэўна Купайчык. — *А. Т.*). Палітычны вязень, які ў першыя дні арыштаваў усіхураднікаў і асоб, якія ўваходзілі ў розныя польскія арганізацыі. Арыштаваных было каля ста чалавек, але па прыбыцці НКВД яны былі выпушчаныя, а праз некалькі тыдняў усе паступова былі арыштаваны і вывезены ў невядомым кірунку. Усе арышты і праверкі адбываліся толькі ўначы. Паборы на карысць арміі былі такія вялікія, што некаторыя засталіся без сродкаў для жыцця і былі вымушаны пабірацца"[14]. Такія ўспаміны пра падзеі восені 1939 г. — нярэдкасць. Але тут варта браць пад увагу, што іх рэтранслятарамі былі людзі, як правіла, падвергнутыя рэпрэсіям савецкай уладай, дэпартаваныя ў глыб Савецкага Саюза. Значыць, успаміны хутчэй за ўсё будуць характарызавацца аднабокасцю і гіпербалізаванасцю з мэтай крытыкі і дыскрэдытацыі новай улады. У дадзеным працытаваным выпадку крыніцай з'яўляецца жыхар вёскі Шашкі, паліцэйскі ў адстаўцы, пенсіянер Андрэй Ставяр. Так, вялікае сумненне выклікае лічба ў 100 арыштаваных адным чалавекам, няхай сабе і з памагатымі. Паводле нашых даследаванняў, лік рэпрэсаваных за ўвесь час панавання „першых саветаў" у вёсках Вялікія і Малыя Круговічы склаў каля чатырох дзясяткаў чалавек[15].

[13] AW, sygn. 132/162, nr 3310 Blinkowski Mikołaj, k. 77.

[14] AW, sygn. 132/162, nr 2350 Stawiarz Andrzej, k. 76.

[15] А. Трафімчык, *Іх рэпрэсавала савецкая ўлада. Спіс асуджаных у 1939-1941 гг. жыхароў Вялікіх і Малых Круговіч*, „Ганцавіцкі краязнаўча-інфармацыйны партал", 03.12.2012 [дата доступу: 13.01.2015], http://www.gants-region.info/

Тым не менш, відавочна, што азначаныя факты для восені 1939 г. былі не адзінкавымі, а выявіліся на ўзроўні тэндэнцыі.

Савецкая ўлада дала магчымасць выплюхнуць назапашаную гнеўную энергію тым, хто быў пакрыўджаны за польскім часам. А неўзабаве пачала арганізоўваць спектакль па сваёй легітымізацыі — Народны сход. Перад яго скліканнем праводзіліся передвыбарныя сходы на месцах. Такія мерапрыемствы, калі верыць успамінам, адбываліся амаль штодзённа і заўсёды пад надзорам палітрукоў. Туды мусілі хадзіць усе, інакш пагражалі жорсткім пакараннем, перш за ўсё зняволеннем і высылкай. Асабліва вытрымліваць дысцыпліну прымушалі ў дзень выбараў. Тады хадзілі па хатах і змушалі людзей галасаваць. У Круговічах праваднікам такой палітыкі стаў С. Купайчык.

Як успамінае згаданы М. Блінкоўскі, да яго таксама заявіліся бальшавіцкія прыслужнікі. Яшчэ напярэдадні ў М. Блінкоўскага экспрапрыіравалі наган (факт наяўнасці зброі можа ўказваць на прыналежнасць за Польшчай яе гаспадара да сілавых ці іншых прыўладных структур). Узброены С. Купайчык у таварыстве А. Зайца загадаў М. Блінкоўскаму пайсці на галасаванне. „Пры ўваходзе ў выбарчае памяшканне ў першым пакоі граў грамафон і ўваходзячым на галасаванне давалася яблыка, зрабаванае з маёнтка, — прыводзіць з памяці карцінку кругавец М. Блінкоўскі, прымушаны такім чынам галасаваць. — У другім пакоі я заўважыў некалькі палітрукоў і прадстаўнікоў НКВД. Уручылі мне там картку, задрукаваную незнаёмымі зусім прозвішчамі, і сказалі кінуць яе ў скрынку, якая стаіць на зэдліку ля сцяны. Падчас галасавання прыехалі на дзвюх машынах некалькі прадстаўнікоў НКВД, якія былі ўзброеныя. Адны з іх засталіся на месцы правядзення выбараў, іншыя выязджалі па такіх жыхароў, якія ў выніку старасці ці хваробы не маглі прыбыць да выбарчага ўчастка. Галасавалі амаль усе, бо былі папярэджаны пра жорсткія рэпрэсіі, якімі пагражалі перад выбарамі”[16].

Агульную характарыстыку выбараў падае і шашковец А. Ставяр, прычым яго заснаваныя на мясцовым, убачаным ім непасрэдна матэрыяле меркаванні можна прымяняць да канкрэтных асоб, у тым ліку стасоўна разглядаемага С. Купайчыка: „Выбары ў Народны сход Заходняй Беларусі суправаджаліся папярэдне вялікай агітацыяй, а падчас выбараў міліцыя і ўсе сімпатыкі савецкага ладу выцягвалі людзей да галасавання, выбаршчык атрымліваў картку, на якой былі ўжо выстаўлены невядомыя кандыдаты, і пад наглядам яго праводзі-

publ/ikh_rehprehsavala_saveckaja_wlada_spis_asudzhanykh_w_1939_1941_gg_zhykharow_vjalikikh_i_malykh_krugovich/3-1-0-224.

16 AW, sygn. 132/162, nr 3310 Blinkowski Mikołaj, k. 77.

лі да ўрны, якая стаяла на стале. Выбарчая камісія складалася пераважна з асоб незнаёмых і асуджаных за польскім часам”[17].

С. Купайчык быў як ніхто зацікаўлены ў паспяховым правядзенні выбараў. Рэч у тым, што адзінай кандыдатурай на Народны сход па акрузе, у якую ўваходзілі вёскі Круговіцкай гміны, быў якраз ён сам. Яго фігура, відаць, зацьміла постаць яшчэ аднаго круговіцкага актывіста — Севасцяна Лелеса 1893 г. нар. Апошні ў 1920-я гг. сфарміраваў цэлую падпольную арганізацыю, якую польская ўлада называла „шайкай”, і займаўся шпіёнскай дзейнасцю, выведваючы і перадаючы за грашовае ўзнагароджанне ў Савецкі Саюз інфармацыю пра польскія вайсковыя аб’екты[18].

Зразумела, што С. Купайчыкам была атрымана трыумфальная перамога — і ён прыняў удзел у Народным сходзе Заходняй Беларусі[19], што прайшоў у Беластоку 28-30 кастрычніка 1939 г. На тым сходзе, сцэнарый якога быў спушчаны з Крамля, прынялі рашэнне аб уваходжанні паўночнай часткі адабраных у Польскай Рэспубліцы тэрыторый у склад БССР.

Жонка круговіцкага дэлегата стала дэпутатам Круговіцкага сельскага савета, утворанага ў верасні 1940 г.

Чарговыя ўцёкі ад немцаў і вяртанне

З наступленнем нямецка-фашысцкай акупацыі Купайчыку і яго жонцы стваралася пагроза быць рэпрэсаванымі з прычыны прыналежнасці да савецкіх уладных структур. Калі Круговічы занялі салдаты вермахта, С. Купайчык адсутнічаў у вёсцы. Ён разам з Андрэем Дулікам, старшынёй круговіцкага калгаса, з прыходам недзе на пятыя суткі вайны ворага ўцяклі, па меркаванні мясцовага насельніцтва, у Расію. Падрабязныя і канкрэтныя акалічнасці такога рашэння і саміх уцёкаў застаюцца невядомымі. Аднак у кожным разе відавочна,

[17] AW, sygn. 132/162, nr 2350 Stawiarz Andrzej, k. 76. Гл. падрабязней пра выбары ў той мясцовасці: А. Трафімчык, *Успаміны „заходнікаў” пра першыя савецкія выбары ў Ганцавіцкім раёне Брэсцкай вобласці*, [у:] *Восень 1939 года ў гістарычнай традыцыі і вуснай гісторыі*, пад рэд. д-ра гіст. н. А. Смаленчука, Мінск 2015, с. 95-104.

[18] Гл. падрабязней: Szajka szpiegowska w Pińsku i w powiecie łuninieckim. Leles i inni — informacja, [w:] AAN, Zespół „Komenda Wojewódzka Policji Państwowej w Brześciu”, sygn. 2018/17 „Działalność inwigilacyjna Policji Państwowej, ustalanie miejsca pobytu, poszukiwanie osób nielegalnie przekraczających granicę. Protokoły z przesłuchań, raporty, korespondencja”, k.190-191. Гл. таксама: А. Трафімчык, *Палітычнае жыццё заходнебеларускага насельніцтва „за Польшчай” у сельскай мясцовасці*, [у:] *Ісці на святло лабірынтамі даўніх падзей. Зборнік памяці Віталя Скалабана*, Мінск 2013, с. 334-336.

[19] M. Gnatowski, *Zgromadzenie Ludowe Zachodniej Białorusi...*, s. 312.

што камуністычны актывіст ахвяраваў сям'ёю з двума непаўналетнімі дзецьмі (Казікам і Броняй) ці то ў імя партыйных інтарэсаў, ці то дзеля выратавання асабістага жыцця.

Марыя Купайчык, як успамінаюць кругаўцы, добрая жанчына, у выніку паплацілася жыццём: у 1941 г. нямецкія акупанты яе, як, дарэчы, і вышэйзгаданага С. Лелеса, расстралялі ў мястэчку Ганцавічы. Разам з маці, па ўсёй верагоднасці, загінула і дачка. Сын Казік перажыў масакру, схаваўшыся пад печчу[20]. Мяркуючы па ўспамінах, кругаўцы шкадавалі Марыю Адольфаўну (у адрозненне ад С. Лелеса, у якім бачылі не столькі селяніна-аднавяскоўца, колькі падзвіжніка знялюбленага да таго часу бальшавізму, а то і звычайнага бандыта), лічылі пакаранне яе неапраўдана высокім, звязваючы яго пры гэтым з дэпутацтвам. Між тым важнейшай прычынай мог стаць той факт, што Марыя Купайчык была замужам за самым галоўным паборнікам савецкай улады ў Кругавічах.

З адступленнем нямецкіх акупацыйных улад летам 1944 г. С. Купайчык адным з першых заявіўся ў родную вёску. „Яго паставілі начальнікам млячарні (mleczarnia (польск.) — малочны завод, маслабойня — *А. Т.*). А быў у млячарні спірт. Ды Купайчык выпіў таго спірту, то дзён тры не гаварыў, адно варушыўся. Ды пажыў дзён тры і памёр"[21].

* * *

Шавец і камуніст Станіслаў Купайчык памёр у 1945 г. (?) і пахаваны на кругавіцкіх могілках. Пра яго грамадска-палітычную дзейнасць нам вядома хоць і небагата, але дастаткова, каб склалася ўражанне — як пра авантурыста, які ў часы палітычнай нестабільнасці „паставіў" сваё жыццё на бальшавікоў, падвергнуўшы рызыцы і членаў сваёй сям'і. У стасунках палітычных апанентаў і тым больш ворагаў панавала і мела ўзаемны характар перш за ўсё жорсткасць. С. Купайчык не быў выключэннем. Ці выйграў ён ад абранага шляху — пытанне спрэчнае, адказ неадназначны. Хутчэй, можна сказаць, бальшавікі скарысталіся з таго авантурызму і рызыкі, распаўсюджваючы праз падобных С. Купайчыку носьбітаў ідэй бальшавізму свае ўплывы і ўладу. А вось наколькі добрыя боты вырабляў гэты рамеснік — у архіўных дакументах не сказана і людская памяць пра гэта маўчыць.

[20] Успаміны Надзеі Адамаўны Блінкоўскай (у дзявоцтве Трафімчык), 1934 г. нар., жыхаркі в. Вялікія Кругавічы (зборы аўтара, 2014 і 2015 гг.); *Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Ганцавіцкага р-на*, Мінск 1999, с. 256.

[21] Успаміны Марыі Сямёнаўны Заяц (у дзявоцтве Занька) 1920 г. нар. Зборы кругавіцкага краязнаўца Сяргея Блінкоўскага, 2014 г. За прадастаўленне гэтай інфармацыі аўтар выказвае ўдзячнасць карэспандэнту.

У заключэнне адзначым, што больш маштабных палітычных фігур у Круговічах пакуль не было. А з суседніх вёсак — у лепшым выпадку раўназначныя. Напрыклад, Аляксандр Свірыд з Начы, які тройчы абіраўся дэпутатам Палаты прадстаўнікоў сучаснай Рэспублікі Беларусь. Але сацыяльная вага С. Купайчыка ў параўнанні з наступнымі яго землякамі-палітыкамі большая, бо набытая ў часы гістарычна паваротныя для Беларусі, у часы гарачыя і небяспечныя для асабістага існавання і жыцця родных.

Summary

A soldier of "the bright future", or the first activist of the Kruhowicze village: Stanisław Kupajczyk (an attempt at a biographical outline)

The article is an attempt at creating a political portrait of Stanisław Kupajczyk, one of the first social activists from a rather typical village of Kruhowicze Wielkie (now in the Hantsavichy District in the Brest Region), a shoemaker and a propagator of socialist ideas. Based on archival documents, witness testimonies and information from scarce publications, the most important events in his political biography have been established. They were analysed in the context of general events and in correlation with the activist's personal life.

In the author's opinion, Stanisław Kupajczyk became acquainted with leftist views during his *bezhenstvo* in Russia. After returning to his homeland, which had become part of the Second Polish Republic, he became actively engaged in political struggle, took part in elections, came into conflict with the law and spent a couple of years in prison. The events of September 1939 provided him with power, which he eagerly used, especially against his class adversaries. He became a deputy to the People's Assembly of Western Belarus. In the summer of 1941 Stanisław Kupajczyk escaped from German-occupied Belarus; his family was killed (his son miraculously survived). After Krupowicze Wielkie was liberated, Stanisław Kupajczyk received a small estate. However, he died a tragic death as a result of alcohol poisoning.

Streszczenie

Szeregowy „świetlanej przyszłości", albo Pierwszy aktywista Kruhowicz: Stanisław Kupajczyk *(próba szkicu biograficznego)*

Artykuł jest próbą stworzenia portretu politycznego jednego z pierwszych działaczy społecznych z dosyć typowej wsi Kruhowicze Wielkie (obecnie rejon hancewicki obwodu brzeskiego) szewca Stanisława Kupajczyka, szerzyciela idei socjalistycznych. Na podstawie dokumentów archiwalnych, relacji świadków, informacji z nielicznych publikacji odtworzone zostały najważniejsze momenty biografii politycznej tego mieszkańca Kruhowicz. Przeanalizowane one zostały w kontekście wydarzeń ogólnych i w korelacji z osobistym życiem działacza.

Autor sądzi, że S. Kupajczyk z poglądami lewicowymi zetknął się podczas bieżeństwa w Rosji. Po powrocie w rodzinne strony, które znalazły się w II Rzeczypospolitej, Kupajczyk angażuje się w walkę polityczną, bierze udział w wyborach, popada w konflikt z prawem i na parę lat trafia do więzienia. Wydarzenia z września 1939 r. obdarzają go władzą, z której skrzętnie korzystał, szczególnie w stosunku do swoich przeciwników klasowych. Został deputowanym Zebrania Ludowego Białorusi Zachodniej. Latem 1941 r. S. Kupajczyk ucieka przed okupacją niemiecką; jego rodzina ginie (cudem ocalał syn). Po wyzwoleniu Kruhowicz Wielkich S. Kupajczyk otrzymał niewielką posadę. Jednak życie stracił raptownie w rezultacie tragicznego zdarzenia – zatrucia spirytusem.

Anatol Trafimczyk — kandydat nauk historycznych i filologicznych, sekretarz naukowy Instytutu Literaturoznawstwa im. Janki Kupały Państwowej Placówki Naukowej „Ośrodek Badań Białoruskiej Kultury, Języka i Literatury Narodowej Akademii Nauk Białorusi". Autor około 200 publikacji naukowych, w tym dwóch monografii.

Тадэвуш Гавін
(Гродна)

Русіфікацыя і саветызацыя публічнага жыцця ў БССР у 1956-1986 гг.

Пасля смерці Сталіна ў сакавіку 1953 г. усё часцей у саюзных рэспубліках, асабліва ў Літве і ва Украіне гучаў лозунг: „Канец з русіфікацыяй, больш правоў для нярускіх народаў!”[1] Лаўрэнцій Берыя, каб захапіць уладу ў СССР выкарыстоўваў нацыянальныя памкненні тых людзей, якія былі зацікаўлены ў сапраўдным адраджэнні іх мовы і культуры. Гэта была апошняя і кароткатэрміновая спроба беларусізацыі партыйнага і дзяржаўнага апарату ў БССР. Берыя непасрэдна ўдзельнічаў у прыняцці пастановы ЦК КПСС, у якой крытыкавалася кіраўніцтва Беларусі, у тым ліку „за памылкі ў нацыянальнай палітыцы”. Але яго спроба паставіць на чале рэспублікі беларуса Міхаіла Зімяніна была беспаспяховай. 25 чэрвеня 1953 г. Зімянін, выступаючы на беларускай мове на чарговым пленуме ЦК КПБ, казаў пра недахопы ў рэалізацыі нацыянальнай палітыкі ў БССР. Аргументаваў гэта тым, што ў партыйных структурах рэспублікі працавалі толькі 62% беларусаў, а ў сямі раённых камітэтах партыі наогул не было ніводнага беларуса[2]. Зімянін прапанаваў, каб у дзейнасці ЦК КПБ, Савета Міністраў БССР, а таксама ўсіх органаў мясцовай улады выкарыстоўвалася беларуская мова. „Мы павінны размаўляць з народам на яго роднай мове”, — казаў Зімянін[3].

Большасць удзельнікаў пленума ўспрыняла выступленне Зімяніна крытычна. Яны падтрымлівалі першага сакратара ЦК КПБ Мікалая Патолічава, рускага, які не ведаў беларускай мовы, і асуджалі тых, хто крытыкаваў яго палітыку. Кропку ў канфлікце паставілі падзеі ў Маскве, звязаныя з арыштам Берыі. Патолічаў застаўся першым сакратаром ЦК КПБ, засталася без змен і нацыянальная палітыка. Варта пры гэтым зазначыць, што пакіданне Патолічава на яго пасадзе з’яўлялася парушэннем раней прынятай пастановы ЦК УКП(б), паводле якой пасады першых сакратароў рэспублік павінны былі займаць мяс-

[1] Падрабязней на гэту тэму гл.: „Правда Украины”, 1953, 13 июня; „Советская Литва”, 1953, 18 июня; T. Gawin, *O bycie Polakiem. Polacy w Białoruskiej Socjalistycznej Republice Radzieckiej 1944-1991*, Grodno — Białystok 2013, s. 335-375.

[2] Л. Лыч, *Міжнацыянальныя дачыненні на Беларусі (верасень 1943 — кастрычнік 1964 г.)*, Мінск 2009, с. 176-185.

[3] Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей: НАРБ), ф. 4р, воп. 20, спр. 296, арк. 22.

цовыя камуністы, а не рускія накіраваныя з Масквы[4]. У сувязі з гэтым узнікае пытанне, чаму БССР была адзінай сярод суседніх рэспублік, дзе вышэйшую партыйную пасаду займаў не прадстаўнік тытульнай нацыі. Пэўна для Масквы гэта было выгодна, каб яе стаўленік надалей кіраваў у БССР, пры гэтым садзейнічаў ажыццяўленню русіфікацыі і саветызацыі насельніцтва. Гісторык з Гродна Сяргей Токць лічыць, што ў большасці партыйнай эліты беларускага паходжання адсутнічала нацыянальная свядомасць, яны адчувалі сябе ў першую чаргу савецкімі людзьмі, што ў іх разуменні гучала горда. Больш за тое, гэтыя людзі даволі часта не валодалі беларускай мовай, лічылі яе вясковай, смешнай, мовай, якая не мае ніякай сімвалічнай каштоўнасці[5]. Такім чынам, пачатак палітычнай „адлігі" ў СССР для беларусаў у адрозненне ад іх суседзяў не прынёс нічога акрамя паскоранага працэсу русіфікацыі і страты сваёй нацыянальнай ідэнтычнасці. Прымусовая русіфікацыя беларусаў праводзілася, парушаючы канстытуцыі СССР і БССР і з маўклівай згоды беларускіх камуністаў.

Пэўныя магчымасці на адраджэнне беларускай мовы і культуры давалі рашэнні XX з'езда ЦК КПСС, які адбыўся ў лютым 1956 г. у Маскве. Мікіта Хрушчоў у сваім выступленні сцвярджаў, што „сацыялізм не толькі не ліквідуе нацыянальныя адрозненні і спецыфічныя асаблівасці, а наадварот — гарантуе ўсебаковае развіццё і росквіт культуры ўсіх народаў і нацыянальнасцей. Таму нашым абавязкам з'яўляецца не пагарда да гэтых спецыфічных рыс і адрозненняў, а ўзяцце іх пад увагу ва ўсёй нашай практычнай працы па кіраванні гаспадарчым і культурным будаўніцтвам"[6]. Апроч таго, Хрушчоў заявіў пра імкненне да пашырэння правоў рэспублік і ліквідацыі шматлікіх абмежаванняў, якія засталіся са сталінскіх часоў. Гэту заяву Хрушчова магчыма разглядаць у якасці пэўнага кроку насустрач пажаданням нацыянальных кадраў у саюзных рэспубліках.

Але першага сакратара ЦК КПБ Мікалая Патолічава як савецкага інтэрнацыяналіста і рускага не цікавілі лёсы беларускай мовы і нацыянальнай культуры. У ліпені 1956 г., калі замест Патолічава пасаду сакратара заняў беларус Кірыла Мазураў[7], з'явіліся рэальныя шансы на

[4] Н. С. Хрущёв, *Воспоминания. Избранные фрагменты*, Москва 1997, с. 274.

[5] S. Tokć, *Kwestia narodowościowa w działalności lokalnych struktur władzy radzieckiej i służb specjalnych w zachodnich obwodach BSRR w latach 1944-1955*, [w:] *Internacjonalizm czy...? Działania organów bezpieczeństwa państw komunistycznych wobec mniejszości narodowych (1944-1989)*, Warszawa — Wrocław 2011, s. 494.

[6] Materiały *XX Zjazdu Komunistycznej Partii Związku Radzieckiego, 14-25 lutego 1956 r., Referaty, wybór przemówień, uchwały i rezolucje*, Warszawa 1956, s. 92.

[7] E. Mironowicz, *Historia państw świata w XX wieku. Białoruś*, Warszawa 2007, s. 273.

беларусізацыю. У адрозненне ад сталінскага перыяду ў той час можна было дзейнічаць, не баючыся арыштаў і рэпрэсій. У БССР пачалі вяртацца людзі, якія былі незаконна асуджаны за „буржуазна-нацыяналістычную дзейнасць”. Такім чынам былі створаны пэўныя ўмовы для адраджэння беларускай культуры. Асабліва важным было тое, што гэтаму працэсу не замінала Масква і ўсё залежала ад ініцыятывы і рашэнняў беларусаў, якія працавалі ў органах партыйнай і савецкай улады. Найбольшы ўплыў на развіццё беларускай мовы і культуры мог аказаць Мазураў. Ён меў рэальныя магчымасці прыпыніць працэс русіфікацыі насельніцтва БССР. І сапраўды, першапачаткова Мазураў спрабаваў праводзіць уласную палітыку беларусізацыі. Ён, як і шматлікія іншыя камуністы рэспублікі, прыняў меркаванне партыйнага кіраўніцтва, што непазбежным элементам дэмакратызацыі з’яўлялася развіццё нацыянальнай культуры[8]. Яўген Мірановіч лічыць, што Мазураў як адданы ідэалам КПСС камуніст своечасова заўважыў, што Хрушчоў і цэнтральны камітэт партыі, нягледзячы на свае публічныя заявы, разглядалі русіфікацыю ў якасці аднаго з галоўных элементаў адзінства савецкай дзяржавы[9]. Гэта стала прычынай таго, што Мазураў хутка адмовіўся ад плана дэрусіфікацыі Беларусі.

Леанід Лыч у сваю чаргу лічыць, што адсутнасць жадання ў Мазурава заангажавацца ў адраджэнне беларускай мовы і культуры была звязана з тым, што ён не меў падтрымкі не толькі ў цэнтральным партыйным апараце ў Мінску, але таксама і ў абласцях, дзе кіруючыя пасады займалі прысланыя Масквой апаратчыкі, якія не мелі ніякага жадання інтэгравацца ў беларускае грамадства з яго традыцыямі. Працэс падтрымкі русіфікацыі Беларусі для іх быў жыццёва неабходным, таму што і надалей яны планавалі сваё існаванне ў асяроддзі развіцця рускай культуры і мовы[10].

У яшчэ больш складанай сітуацыі захавання сваёй мовы і культуры знаходзілася польская нацыянальнай меншасць. Пасля масавых расстрэлаў у 1937-1938 гг., ліквідацыі Польскага нацыянальнага раёна, палякі не мелі магчымасці займаць пасады ў органах партыйнай і савецкай улады. Знішчэнне польскамоўнай адукацыі, цэнтраў польскай культуры і друку ўключылі польскую меншасць у фарсіраваны працэс русіфікацыі. Гэты злачынны ўдар, які быў нанесены па польскасці ва ўсходніх раёнах БССР, выклікаў вялікія людскія страты, а таксама ліквідацыю далейшай магчымасці развіцця польскай мовы

[8] *Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК*, т. 5, Минск 1986, с. 42-43.

[9] E. Mironowicz, *Historia państw świata w XX wieku. Białoruś*, s. 273.

[10] Л. Лыч, *Міжнацыянальныя дачыненні...*, с. 187-188.

і культуры. Гэтыя страты не ўдалося аднавіць да сённяшняга дня, таму што на працягу ўсяго савецкага перыяду такога жадання не было ў кіраўніцтва ні ў Мінску, ні ў Маскве. Апроч таго ўсе тыя, хто мог бы пасля смерці Сталіна заняцца польскім адраджэннем, былі забітыя. Усе астатнія нешматлікія прадстаўнікі інтэлігенцыі палічылі вартым больш не вяртацца да польскага пытання[11].

Палякі з былых паўночна-ўсходніх тэрыторый Другой Рэчы Паспалітай пасля 17 верасня 1939 г. трансфармаваліся з карэнных польскіх грамадзян у польскую нацыянальную меншасць Заходняй Беларусі, якой сілай навязалі грамадзянства СССР. Жорсткія і бязлітасныя рэпрэсіі ў 1939-1953 гг., вымушанае палітычнай сітуацыяй перасяленне палякаў у Польшчу ў 1944-1946 гг., так званая рэпатрыяцыя ў 1955-1959 гг., наступствы звязаныя з калектывізацыяй, а таксама ліквідацыя польскіх школ і арганізацыйных структур Каталіцкага касцёла прывялі польскую супольнасць у заходніх абласцях БССР да становішча выжывання. Цалкам дэзынтэграваная як ва ўсходніх, так і ў заходніх рэгіёнах Беларусі польская меншасць, не маючы прадстаўніцтва ў органах улады (якое магло б абараніць яе нацыянальныя інтарэсы), апынулася на ўскраіне грамадска-палітычнага жыцця ў БССР. У адрозненне ад палякаў у Літве польская меншасць у БССР не змагла выкарыстаць для паляпшэння свайго становішча змены, якія адбываліся пасля смерці Сталіна і ХХ з'езда КПСС[12].

Насуперак заяве Хрушчова на ХХ з'ездзе КПСС пра садзейнічанне ўсебаковаму развіццю нацыянальных асаблівасцей[13], мясцовымі ўладамі ў БССР актыўна праводзілася русіфікацыя беларусаў і палякаў.

Нацыянальныя мовы ў савецкіх рэспубліках адыгрывалі важную ролю ва ўмацаванні нацыянальнай свядомасці насельніцтва. Там, дзе паспяхова супрацьдзейнічалі русіфікацыі, развівалася мясцовая культура, а нацыянальная мова станавілася галоўнай мовай камунікацыі як у прыватнай, так і ў публічнай прасторы. І наадварот там, дзе нацыянальная мова адсоўвалася на другі план, русіфікацыя развівалася ў геаметрычнай прагрэсіі.

Стратэгічнай памылкай беларускіх дзяржаўных дзеячаў і нацыянальнай інтэлігенцыі была недаацэнка ролі адукацыі на роднай мове. У прынцыпе, па-іншаму і не магло быць. Прысланыя з усходу СССР

[11] Да такіх інтэлігентаў можна аднесці Галіну Раманоўскую з Мінска. Падрабязней на гэту тэму гл.: T. Gawin, *Polskość na Białorusi 1988-2005*, Białystok 2010, s. 151-152.

[12] Падрабязней пра становішча палякаў у Літве ў гэты час гл.: A. Srebrakowski, *Polacy w Litewskiej SRR 1944-1989*, Toruń 2001.

[13] *Materiały XX Zjazdu Komunistycznej Partii Związku Radzieckiego, 14-25 lutego 1956 r., Referaty, wybór przemówień, uchwały i rezolucje...*, s. 89.

на кіруючыя пасады рускамоўныя партыйныя і савецкія дзеячы везлі з сабой педагагічныя кадры для працы ў школах і ВНУ на рускай мове. Такім чынам настаўнікі і выкладчыкі станавіліся інструментам у руках улады, якая імкнулася русіфікаваць БССР. Яны адчувалі сябе гаспадарамі, а часамі ў іх паводзінах праяўляліся элементы дыскрымінацыі мясцовага насельніцтва (у першую чаргу ў выкарыстанні сваёй роднай мовы ў публічных месцах). Былі выпадкі, калі дырэктары школ забаранялі настаўнікам размаўляць на беларускай мове ў школе і на вуліцы[14].

У падобнай сітуацыі апынуліся і палякі. Адным са шматлікіх прыкладаў дыскрымінацыі палякаў з'яўляецца дзейнасць школы ў вёсцы Сонічы Гродзенскага раёна, дзе жылі пераважна палякі. Жыхар гэтай вёскі Ян Садоўскі казаў у інтэрв'ю для журналісткі газеты „Czerwony Sztandar": „У шасцідзясятыя гады ў школе нам забаранялі размаўляць на польскай мове нават на перапынках"[15].

Шматлікія настаўнікі, якія прыехалі з усходніх раёнаў СССР, часта былі ініцыятарамі правядзення размоў з бацькамі пра перапрафіляванне школ з беларускай мовы навучання на рускую[16]. Нават настаўнікі з мясцовага насельніцтва, якія скончылі Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, у беларускамоўных школах выкладалі свае прадметы на рускай мове, бо самі навучаліся на гэтай мове ва ўніверсітэце[17]. Наступствам адсутнасці зацікаўленасці ў развіцці беларускамоўнай адукацыі ў БССР стала скарачэнне школ з беларускай мовай выкладання. У 1957 г. у Брэсце з 15 такіх школ засталася толькі адна, у Гродне з 13 — 2, а ў Пінску з 12 — ніводнай[18].

Крэмль, фарсіруючы палітыку русіфікацыі, у 1958 г. правёў школьную рэформу[19]. У выніку з асабістай ініцыятывы Хрушчова пачаўся працэс укаранення рускай мовы ў школьную адукацыю саюзных рэспублік[20].

Паводле Пастановы ЦК КПБ „Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і далейшым развіццём народнай адукацыі ў Беларускай ССР" з красаві-

[14] „Наша слова", 1992, 2 снежня.

[15] L. Komaiszko, *Grodzieńszczyzna: chcemy mieć tę polskość. 3. Na teraz i potem*, „Czerwony Sztandar", 1988, 15 grudnia.

[16] Л. Лыч, *Міжнацыянальныя дачыненні...*, с. 209.

[17] „Звязда", 1957, 12 траўня.

[18] „Звязда", 1992, 17 верасня.

[19] Падрабязней на гэту тэму гл.: Л. Нарядкина, *Школьная реформа 1958 года и национальное образование*, „Фундаментальные исследования", 2005, № 4, с. 35-36; Л. Кумель, *Образование в эпоху Хрущёва: „оттепель" в педагогике?*, „Неприкосновенный запас", 2003, № 2.

[20] B. Lewićkyj, *Polityka narodowościowa Z.S.S.R. w dobie Chruszczowa*, Paryż 1966, s. 94.

ка 1959 г. навучанне на беларускай мове і яе вывучэнне цалкам залежалі ад жадання вучняў і іх бацькоў. Прыняцце гэтай пастановы прывяло да таго, што фактычна ў пачатку 1960-х гг. выкладанне на беларускай мове ў гарадскіх школах спынілася[21]. У сярэдніх школах Мінска ў 1969 г. 90% вучняў наогул не вывучалі беларускай мовы[22]. Беларускамоўнае навучанне ў гэты час захавалася выключна ў вёсках і маленькіх гарадах[23].

Школьная рэформа ў СССР і прапановы Хрушчова былі накіраваны на тое, каб у школах з рускай мовай выкладання зусім убраць вывучэнне нацыянальных моў рэспублік як абязковага прадмета. Мэтай гэтай рэформы нібыта быў клопат пра дзяцей, якія былі занадта перагружаны школьнай праграмай. А на самой справе такія дзеянні ўлад прыводзілі да ўніфікацыі і ўзмацнення русіфікацыі насельніцтва. Савецкія прапагандысты казалі ў той час аб „добраахвотнай адмове" цэлых нацыянальных груп ад навучання на мовах рэспублік і іх вывучэння, прадстаўлялі гэтую з'яву ў якасці перамогі ідэі сяброўства паміж народамі на этапе будаўніцтва камунізму.

У студзені 1959 г. на святкаванне 40-й гадавіны ўтварэння БССР у Мінск з афіцыйным візітам прыехаў Мікіта Хрушчоў. Беларускамоўнае выступленне на ўрачыстым сходзе Кірылы Мазурава выклікала ў Хрушчова абурэнне. У сувязі з гэтым ён некалькі разоў публічна заявіў: „Чым хутчэй мы ўсе будзем размаўляць па-руску, тым хутчэй пабудуем камунізм"[24].

У сакавіку 1965 г. пасля абрання Пятра Машэрава на пасаду першага сакратара ЦК КПБ па беларускай мове быў нанесены чарговы ўдар. У БССР пачаўся імклівы працэс пераводу школ з беларускай мовы навучання на рускую. Галоўная задача Машэрава заключалася ў тым, каб Беларусь стала ўзорнай рэспублікай у рэалізацыі савецкай нацыянальнай палітыкі, гэта значыць у пабудове ў СССР адной гістарычнай і культурнай супольнасці — савецкага народа. Гэта задача патрабавала адмовы беларусаў і іншых нацыянальнасцей ад уласнай самасвядомасці, мовы і культуры. Як лічыць Я. Мірановіч, трагедыяй Беларусі было тое, што яе вышэйшае кіраўніцтва, у адрозненне ад партыйнай эліты прыбалтыйскіх рэспублік, было глыбока ўпэўнена ў неабходнасці рэалізацыі такой нацыянальнай палітыкі і з вялікім энтузіязмам яе ўкараняла[25]. Пасля пятнаццацігадовага кіраўніцтва

[21] E. Mironowicz, *Historia państw świata w XX wieku. Białoruś*, s. 275.

[22] НАРБ, ф. 42, воп. 7, спр. 2630, арк. 108. *Письмо министра образования БССР Л. Сухнат в ЦК КПБ, 24.12. 1987.*

[23] E. Mironowicz, *Historia państw świata w XX wieku. Białoruś*, s. 275.

[24] Ю. Коряков, *Языковая ситуация в Белоруссии и типология языковых ситуаций*, дисс. ... канд. филолог. наук. МГУ им. М. В. Ломоносова. 2003, с. 39-40.

[25] E. Mironowicz, *Historia państw świata w XX wieku. Białoruś*, s. 273-274.

рэспублікай Машэравым сітуацыя з беларускамоўным навучаннем даволі моцна пагоршылася. Адлюстраваннем „клопату" пра нацыянальную мову і культуру беларусаў з'яўляецца стан іх сталіцы. Як бачна з табліцы 1, у Мінску ў 1980-1987 гг. не было ніводнай школы з беларускай мовай навучання.

Табліца 1. Мовы навучання ў школах БССР у 1980-1987 гг.

Год	1980/1981				1986/1987			
	вёска	горад	вёска і горад	у тым ліку ў Мінску	вёска	горад	вёска і горад	у тым ліку ў Мінску
Усяго школ	5636	924	6559	150	4711	993	5704	178
З рускай мовай навучання	699	908	1607	150	719	987	1706	177
З беларускай мовай навучання	4900	9	4909	—	3978	5	3983	—
З дзвюма мовамі навучання	36	7	43	—	14	1	15	1

Крыніца: НАРБ, ф. 42, воп, 7, спр. 2630, акр. 108. *Письмо министра образования Л. Сухнат в ЦК КПБ, 24.12. 1987.*

З пачатку 1960-х гг. у нацыянальных аўтаноміях і рэспубліках Савецкага Саюза праводзілася палітыка, накіраваная на стварэнне з іх насельніцтва адзінай супольнасці — савецкага народа[26]. Для гэтага выкарыстоўваліся ўсе сродкі, якія мелі ўлады, за выключэннем тых, што былі звязаны з жорсткімі рэпрэсіямі. Улады ў Маскве імкнуліся праз русіфікацыю асіміляваць беларусаў, а таксама палякаў, ліквідаваць іх нацыянальную ідэнтычнасць і самабытнасць. Менавіта ў 1960-я гг. савецкае і партыйнае кіраўніцтвы пачалі вынішчаць беларускасць у вёсцы, якая на іх меркаванне з'яўлялася перашкодай на шляху да больш хуткага аб'яднання ўсіх народаў БССР у савецкую супольнасць. У выніку самыя папулярныя ў вёсцы беларускія газеты „Калгасная праўда" і „Сельская гаспадарка Беларусі" пачалі выдавацца на рускай мове[27]. Так як гэтыя газеты з'яўляліся друкаваным органам партыі, то ніхто як з боку беларускай інтэлігенцыі, так і простага мясцовага насельніцтва Беларусі, не кажучы пра беларусаў на дзяр-

[26] П. Г. Семёнов, *Программа КПСС о развитии национально-государственных отношений,* „Советское государство и право", Москва 1961, № 12, с. 15-25

[27] Л. Лыч, *Міжнацыянальныя дачыненні...*, с. 217.

жаўнай службе і партыйнай працы, гэтаму рашэнню не супраціўляліся. Тым больш, такая пагарда да беларускай мовы для Беларусі не была незвычайнай з’явай. Першыя сігналы знявагі да беларускамоўных чытачоў назіраліся ва ўсіх заходніх абласцях адразу пасля вайны, калі газеты пачалі масава друкаваць на рускай мове. 23 жніўня 1947 г. накіраваны з усходу СССР першы сакратар Пінскага абласнога камітэта партыі ў сваім лісце ў ЦК КП(б)Б пісаў: „Пасля вайны нацыянальны склад Пінскай вобласці значна змяніўся. У раёнах вобласці засталася і працуе вялікая колькасць дэмабілізаваных з арміі грамадзян рускай нацыянальнасці. Чыгунка і водны транспарт, установы і прадпрыемствы з большага ўкамплектаваны кадрамі рускай нацыянальнасці. Гэта частка насельніцтва пазбаўлена магчымасці чытаць і выкарыстоўваць мясцовы друк у сваёй працы ў сувязі з няведаннем беларускай мовы. Усе гэтыя абставіны прывялі да неабходнасці бюро абласнога камітэта партыі звярнуцца ў ЦК з просьбай аб дазволе выдання абласной газеты на рускай мове”[28]. Малаколькасная руская меншасць цынічна пазбаўляла беларускую большасць права на атрыманне інфармацыі ў друку на роднай мове.

У 1960-я гг. даволі актыўна культурныя ўстановы пераходзілі на выкарыстанне рускай мовы. У 1960 г. на беларускай мове было надрукавана толькі 26,5% асобных кніжных выданняў, праз дзесяць гадоў — 19,6%, а ў 1980 г. — 12,3%. Змест беларускамоўнай літаратуры ў большасці быў непрывабным для чытачоў. Здаралася так, што творы беларускіх класікаў моладзь чытала ў перакладзе на рускую мову[29].

Леанід Лыч сцвярджае, што прымусовая і пастаянна прагрэсіруючая русіфікацыя ўсіх сфер жыцця ў БССР была звязана з тым, што ў Беларусі як у пасляваенны час, так і да пачатку „перабудовы” не з’явіліся асобная сіла і сапраўдны лідар беларускага народа, якія не толькі разумелі б месца беларускай мовы і культуры ў жыцці насельніцтва, але і былі б гатовыя смела выступіць у абарону нацыянальнай самабытнасці, незалежна ад наступстваў для кар’еры і нават для бяспекі свайго жыцця[30].

Варта пры гэтым прызнаць, што спробы абароны беларускай мовы і культуры ў гэты час былі. Але можа не такога маштабу як хацеў бы Леанід Лыч. У 1976 г. пераважна ў асяроддзі беларускай інтэлектуальнай эліты быў распаўсюджаны напісаны ананімным аўтарам „Ліст да

[28] НАРБ, ф. 4п, воп. 29, спр. 570, арк. 438-439. *Письмо секретаря пинского ОК КП(б)Б Тетюшева к секретарю ЦК КП(б)Б Гусарову, 23.08.1947.*

[29] E. Mironowicz, *Historia państw świata w XX wieku. Białoruś*, s. 274-275.

[30] Л. Лыч, *Міжнацыянальныя дачыненні...*, с. 246.

рускага сябра"[31]. Ён перапісваўся ўручную і тысячнымі экземплярамі перадаваўся з рук у рукі. У лісце адлюстроўваўся катастрафічны стан беларускай мовы, у тым ліку беларускамоўнай адукацыі. Роўныя шансы развіцця беларускай і рускай моў, пра якія гаварыла савецкая камуністычная прапаганда, аўтар параўноўваў з шансамі Чырвонага Каптурка і Шэрага Ваўка падчас іх сустрэчы ў лесе. У снежні 1986 г. група беларускіх інтэлектуалаў, занепакоеная русіфікацыяй грамадска-палітычнай і гаспадарчай сфер дзейнасці, накіравала ліст да Гарбачова, у якім прасіла яго даць указанне ўладам БССР, каб тыя змянілі сваё стаўленне да беларускай мовы і культуры. Ліст меў дадатак, у якім на сямі аркушах апісваўся прыгнечаны стан беларускай мовы[32].

Палітыку русіфікацыі ў БССР актыўна праводзілі не толькі прыехаўшыя з усходу СССР рускія, але і прызначаныя Крамлём на розныя пасады прадстаўнікі мясцовага насельніцтва. У 1970-я гг. больш за 70% сакратароў абкамаў партыі былі беларусы. У іх руках практычна знаходзілася ўся паўната ўлады ў рэгіёнах. Калі б яны з'яўляліся нацыянальна свядомымі і сапраўднымі прадстаўнікамі беларускага народа, а не стаўленікамі Крамля, то маглі б шмат зрабіць для развіцця беларускай культуры. Іх кар'ера, кар'ерны рост і чаканні вышэйстаячага кіраўніцтва ў структурах улады знаходзіліся ў супярэчнасці з нацыянальнай культурай і роднай мовай. Табліца 2 адлюстроўвае наколькі ўплывовай сілай у супрацьдзеянні працэсу русіфікацыі маглі б стаць беларусы, якія займалі пасады сакратароў абкамаў партыі. З гэтай табліцы таксама бачна, што палякі ў сістэме палітычнай улады БССР не карысталіся поўным даверам. Яны зусім не займалі пасад сакратароў абласных камітэтаў партыі.

Табліца 2. Сакратары абласных камітэтаў КПБ

Год / Пералік	*1946*		*1976*		*1981*		*1986*	
	Кольк.	*%*	*Кольк.*	*%*	*Кольк.*	*%*	*Кольк.*	*%*
Рускія	24	40,0	7	23,3	6	20,0	6	20,7
Украінцы	2	3,3	(-)	(-)	(-)	(-)	(-)	(-)
Беларусы	**32**	**53,3**	**23**	**76,7**	**24**	**80,0**	**23**	**79,3**

[31] Аўтарам ліста быў беларускі паэт Аляксей Каўка. Падрабязней на гэту тэму гл.: А. Кавка, *Письмо русскому другу*, „Скарыница", 1991, с. 167.

[32] E. Mironowicz, *Historia państw świata w XX wieku. Białoruś*, s. 278.

Палякі	(-)	(-)	(-)	(-)	(-)	(-)	(-)	(-)
Габрэі	2	3,3	(-)	(-)	(-)	(-)	(-)	(-)

Крыніца: T. Gawin, *O bycie Polakiem. Polacy w Białoruskiej Socjalistycznej Republice Radzieckiej 1944-1991*, Grodno — Białystok 2013, s. 366.

Беларускія партыйныя дзеячы праводзячы русіфікацыю ў БССР крытыкавалі тых, хто спрабаваў гэтаму супрацьдзейнічаць, напрыклад, хто пісаў пра гэты працэс у замежных сродках масавай інфармацыі. Першы сакратар Гродзенскага абкама партыі Леанід Кляцкоў, выступаючы 4 лютага 1966 г. на XII абласной партыйнай канферэнцыі сказаў: „Варожую прапаганду на нашу рэспубліку, у сярэднім 11 гадзін у суткі, вяшчаюць шмат заходніх радыёстанцый. Галоўныя намаганні нацыяналістычнай прапаганды накіраваны на падрыў сяброўства паміж народамі СССР, сяброўства беларускага і рускага народаў. Адным з любімых прыёмаў буржуазных ідэалагічных дыверсантаў з'яўляецца тэзіс пра так званую «гвалтоўную русіфікацыю» беларускага народа”[33].

Насаджэнне рускай мовы ў Беларусі, пастаянная знявага беларускай мовы і стварэнне ўмоў для яе высмейвання выклікалі агрэсію ў грамадстве да людзей, якія размаўлялі па-беларуску. Крайнім выпадкам такой агрэсіі стала забойства ў пачатку 1966 г. у Мінску Ігара Хадановіча за тое, што ён гаварыў на сваёй роднай мове. Уладзімір Караткевіч[34] у сваім дзённіку з нагоды гэтай трагедыі пісаў: «У адзін з тых дзён хавалі бедалагу Ігара Хадановіча. Таленавіты хлопчык, бедны хлопчык. Няшчасны лёс... Гэтая свалата, якая забіла яго, і словы яе: „Раечка, подожди, я тут одного пшека научу говорить по-русски” стаяць у вушах. І вось свалоце, забойцу дадуць максымум восем год, а чалавеку, які абяцаў расьцьвісьці ў неабыякога празаіка, — магіла. Я люблю людзей, але менавіта таму гэткіх, як тое быдла, што гаспадарыць у нашым горадзе, ды яшчэ ногі на стол кладзе, — я прылюдна вешаў бы. Зьбіць, а пасьля вярнуцца з бандай яшчэ раз, наваліцца на сплываючага крывёй і дабіць»[35].

33 Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гродзенскай вобласці, ф. 1, воп. 1, спр. 830, арк. 22. *Протокол XII Гродненской Областной Партийной Конференции, 4.02.1966*.

34 Караткевіч Уладзімір Сямёнавіч (1930-1984) — беларускі савецкі пісьменнік, паэт, драматург, сцэнарыст і публіцыст, класік беларускай літаратуры.

35 Падрабязней на гэту тэму гл.: С. Абламейка, *За што Караткевіч не любіў Менск*, http://www.svaboda.org/a/27373511.html; [дата доступу: 20 лістапада 2015].

16 жніўня 1968 г. міністр адукацыі БССР Мурашка, выступаючы на нарадзе абласнога актыву ў Брэсце казаў: „Школа павінна сфарміраваць у маладога пакалення камуністычны светапогляд, выхаваць вучняў у духу калектывізму, любові да сваёй радзімы, уменню рашуча супрацьдзейнічаць любым праявам буржуазнай ідэалогіі"[36]. Удзельнікі нарады найбольш важнымі заданнямі ў сферы адукацыі палічылі: „узбраенне" вучняў „у моцныя веды", матэрыялістычны светапогляд, ідэйную ўстойлівасць і камуністычную маральнасць, падрыхтоўку школьнікаў да актыўнага палітычнага жыцця[37]. Пры гэтым ніхто не ўзгадаў аб праблемах беларускамоўнай школьнай адукацыі. Русіфікацыя ўсіх сфер дзейнасці ў вобласці згодна з рашэннямі гэтай нарады павінна была працягвацца.

Ва ўмовах, калі беларуская ўлада і нацыянальна свядомая частка беларускага грамадства мелі розныя мэты і памкненні, даволі цяжка было падтрымліваць і развіваць нацыянальную ідэнтычнасць беларусаў. Яшчэ складаней было існаваць палякам. Толькі сям'я і рэшткі Каталіцкага касцёла заставаліся адзінымі асяродкамі, якія супраціўляліся дэпаланізацыі і русіфікацыі палякаў у БССР.

Савецкая ўлада пастаянна праводзіла разгалінаваную і паслядоўную палітыку асіміляцыі беларускіх палякаў і інтэграцыі іх у савецкае грамадства. Гэта палітыка абапіралася на тэорыю, што польскасць у Беларусі з'яўлялася наступствам шматвяковай яе „акупацыі" польскай дзяржавай, што тут не было карэнных палякаў, а толькі апалячаныя беларусы[38]. Таму намаганні ўлад былі накіраваны на знішчэнне польскасці як чужога элемента ў БССР.

Пры гэтым у афіцыйным дыскурсе панавала меркаванне пра развіццё культуры, традыцый нацыянальных меншасцей. „Насельніцтва савецкіх рэспублік з'яўляецца шматнацыянальным, — гаварылася на XXVI з'ездзе КПСС[39]. — Таму натуральным з'яўляецца тое, што ўсе народы нашай краіны маюць права на сваё прадстаўніцтва ў партыйных і дзяржаўных органах улады. (...) Акрамя гэтага яны маюць свае спецыфічныя патрэбы ў сферах мовы, культуры і звычаяў. (...) **У нашай краіне з павагай ставяцца да нацыянальных пачуццяў і нацыянальнай годнасці кожнага чалавека (**вылучана — Т. Г.). КПСС змагалася і заўсёды будзе рашуча змагацца з чужымі сацыялізму праяўленнямі, такімі як шавінізм або нацыяналізм, супраць

[36] ДАБВ, ф. 1п, воп. 23, спр. 17, акр. 117. *Протокол III Пленума Брестского Областного Комитета Партии, 16.08.1968.*

[37] Тамсама, арк. 130.

[38] Расійскі дзяржаўны архіў навейшай гісторыі, ф. 5, воп. 18, спр. 60, арк. 12.

[39] Праходзіў 23 лютага — 3 сакавіка 1981 г. у Маскве.

усялякага роду нацыяналістычных перагібаў. Мы выступаем супраць тэндэнцый накіраваных на штучнае сціранне нацыянальных рыс"[40].

Міхаіл Гарбачоў на першым пасля пачатку „перабудовы" з'ездзе КПСС у 1986 г. сказаў: „Традыцыяй нашай партыі, якая свой пачатак бярэ ад Леніна, з'яўляюцца асаблівая ўважлівасць і ўзважлівасць ва усім, што датычыцца нацыянальнай палітыкі, інтарэсаў кожнага народа і народнасці, нацыянальных пачуццяў, і адначасова прынцыповая барацьба з праяўленнямі нацыянальнай абмежаванасці і ганарыстасці, нацыяналізму і шавінізму, нягледзячы на тое, у якія строі яны апранаюцца"[41].

Нацыянальная палітыка Масквы ў адносінах да Беларусі была люстэркавым адбіткам палітыкі цэнтральных беларускіх улад у дачыненні да беларускіх палякаў. Масква русіфікавала БССР, а беларускія ўлады — палякаў. Вышэйпрыведзеная заява Гарбачова не адпавядала рэчаіснасці і была адрасавана замежным гасцям з'езда, якія не маглі ведаць рэальны стан спраў з рэалізацыяй на практыцы нацыянальнай палітыкі ў СССР.

Улічваючы палітычную абстаноўку ў Савецкім Саюзе, у тым ліку ў БССР, звязаную з „перабудовай", можна прыйсці да высновы, што калі б у той час палякі Беларусі, якія займалі кіруючыя пасады ў органах улады, а таксама ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, аб'ядналіся і стварылі нефармальную арганізацыю і, абапіраючыся на канстытуцыі СССР і БССР, рашэнні з'ездаў партыі, вопыт Літвы датычны польскага пытання, патрабавалі рэалізацыі сваіх канстытуцыйных правоў, то магчыма, што ўдалося б кардынальна змяніць іх становішча ў Беларусі. Але не знайшлося лідара сярод беларускіх палякаў. Прычынай адсутнасці ініцыятывы з іх боку варта шукаць у іх раз'яднанасці і дэзынтэграцыі польскага грамадства ў БССР, якія былі выкліканы комплексам жорсткіх і крывавых рэпрэсій, што пачаліся адразу пасля бальшавіцкага перавароту ў 1939 г. і скончыліся толькі пасля смерці Сталіна.

Дарэмна было чакаць ад палякаў, выхадцаў з сямей працоўных і сялян, інтэлігентаў у першым пакаленні, якім удалося атрымаць вышэйшую адукацыю і падняцца па кар'ернай лесвіцы, дзякуючы існуючай уладзе, нейкіх гераічных учынкаў, у выніку якіх можна было ўсё страціць. Да таго ж усе яны, без выключэння, былі ўведзены ў дарослае жыццё русіфікаванай і саветызаванай школай, у адрыве ад сваёй род-

40 *XXVI Zjazd Komunistycznej Partii Związku Radzieckiego, 23.02-3.03.1981. Podstawowe dokumenty*, Warszawa 1981, s. 89.

41 *XXVII Zjazd komunistycznej Partii Związku Radzieckiego, 25.02-6.03.1986. Podstawowe dokumenty*, Warszawa 1986, s. 84.

най мовы, культуры, рэлігіі і Польшчы. Шматлікія з іх, а можа быць і большасць, адчувалі сябе больш савецкімі грамадзянамі, чым палякамі. Яны бачылі двудушнасць савецкай палітычнай сістэмы, у якой права было створана напаказ, а не для строгага яго выканання. Яны таксама разумелі, што ў выпадку парушэння наменклатурнага правіла — „не высоўвацца" — іх чакала небяспека страты ўсяго раней дасягнутага ў працы, звальненне і цяжкасці з працаўладкаваннем.

Вялікая доля адказнасці за пастаянную русіфікацыю беларускіх палякаў пасля смерці Сталіна і ХХ З'езда КПСС, а таксама падчас хрушчоўскай „адлігі" ляжыць на камуністычных уладах Польскай Народнай Рэспублікі. ПНР не толькі не выкарыстала гэтыя гістарычныя падзеі, каб дапамагчы беларускім палякам у адраджэнні польскамоўнай адукацыі і польскай культуры, садзейнічаць аб'яднанню палякаў у культурна-асветніцкія таварыствы, як беларусы ў Польшчы[42], але нават дыпламатычныя прадстаўніцтвы — пасольства ў Маскве[43] і Генеральнае консульства ў Мінску — не падтрымлівалі ніякіх сувязей з польскай нацыянальнай меншасцю ў БССР. Варта таксама адзначыць, што нягледзячы на вялікую колькасць праведзеных двухбаковых польска-савецкіх сустрэч, ніколі ў перыяд з 1956 да 1986 гг. польскія дыпламаты не падымалі пытанні культурна-асветніцкай дзейнасці палякаў у БССР і магчымасці польскамоўнай адукацыі[44].

Адсутнасць распрацаванай палітыкі польскіх улад у дачыненні да польскай нацыянальнай меншасці ў БССР яшчэ больш развязвала рукі кіраўніцтву Савецкага Саюза і Савецкай Беларусі, якія актыўна праводзілі дэпаланізацыю і татальную русіфікацыю беларускіх палякаў. Наступствы такой палітыкі савецкай улады асабліва адчувальны ў другой дэкадзе XXI ст.

Усё гэта разам узятае паўплывала на тое, што ў 1956-1986 гг. у БССР не адбылося адраджэння польскага культурна-адукацыйнага жыцця, у адрозненне ад суседняй Літвы. Польскія дзеці і моладзь былі пазбаўлены магчымасці не толькі навучацца на роднай мове, але і больш таго, не маглі нават вывучаць польскую мову ў беларускіх школах насуперак раней прынятым партыйным рашэнням і ўказан-

[42] Дазволіўшы ў 1956 г. беларусам у Польшчы стварыць Беларускае грамадска-культурнае таварыства, а таксама друкаваць штотыднёвік „Ніва", улады ПНР маглі патрабаваць узамен у Масквы пэўных саступак у нацыянальнай палітыцы датычнай палякаў у БССР.

[43] Пра бяздзейнасць польскага пасольства ў Маскве па пытанні польскай нацыянальнай меншасці ў БССР гл.: S. Uszakiewicz, *Być Polakiem*, „Głos znad Niemna", 1992, nr 3 (14).

[44] Падрабязней на гэту тэму гл.: *Stosunki dyplomatyczne Polski. 1944-1977 r. Informator*, t. 1: *Europa — państwa socjalistyczne*, Warszawa 1978.

ням. Адбываліся мэтанакіраваныя русіфікацыя і дэпаланізацыя палякаў, а таксама прымусовае далучэнне іх да „савецкай супольнасці". Менавіта на гэтых прынцыпах грунтавалася нацыянальная палітыка беларускіх камуністычных улад, якія служылі вялікадзяржаўным інтарэсам Крамля, а не ўласнаму народу. Пры гэтым, варта зазначыць, што прызначаныя Масквой партыйныя і савецкія ўлады Беларусі не маглі па-іншаму ставіцца да палякаў, калі ў той жа час яны зневажальна адносіліся да беларускай мовы і культурных патрэб беларусаў.

Summary

The Russification and Sovietisation of public life in the BSSR in the years 1956-1986

Up until the end of the 1980s, the Soviet regime continuously conducted a consistent large scale policy of Russification and Sovietisation of both Belarusians and Poles in the BSSR. The main ideological pillar of this policy toward Poles was a theory that the sense of Polish national identity in Belarus was a consequence of the centuries-long occupation of „Belarus" by the Polish state and that there were no indigenous Poles in Belarus, but only Polonised Belarusians. According to the official ideological doctrine, the sooner the Polish national identity, as a foreign body, was uprooted, the better.

The indifference towards the Polish minority in the BSSR on the part of the government of the Polish People's Republic allowed the authorities of the Soviet Union and the BSSR to conduct with impunity their policy of dePolonisation and complete the Russification of Belarusian Poles, the adverse consequences of which can be particularly felt at the beginning of the first decade of the 21st century.

The attitude of the Soviet regime towards the question of Polish national identity in Belarus shows that its policy of destruction was well co-ordinated by the authorities. This can be evidenced by the fact that in Belarus, in contrast to Lithuania and Ukraine, Polish social life did not exist at all and there were no conditions for its revival until Gorbachev's perestroika.

Representatives of the new (first-generation) party intelligentsia, holding management positions in the structures of the party and Soviet authorities, were drawn by the highest Soviet officials into the process of the Sovietisation and Russification of Poles in the BSSR, and they were not mere observers but active participants in that process and its dedicated executors.

Streszczenie

Rusyfikacja i sowietyzacja życia publicznego w BSRR w latach 1956-1986

Władze sowieckie bez przerwy, aż do końca lat 80. XX w. prowadziły w BSRR szeroko zakrojoną i konsekwentną politykę rusyfikacji i sowietyzacji zarówno Białorusinów, jak i Polaków. Głównym filarem ideologicznym takiej polityki wobec Polaków była teoria, że polskość na Białorusi jest konsekwencją wielowiekowej okupacji „Białorusi" przez państwo polskie, że na Białorusi nie ma rdzennych Polaków, są jedynie spolonizowani Białorusini. Oficjalna doktryna ideologiczna głosiła: im wcześniej uda się wykorzenić polskość jako obce ciało, tym lepiej.

Obojętność władz PRL-u w stosunku do mniejszości polskiej w BSRR spowodowała, że władze ZSRR oraz BSRR mogły bezkarnie prowadzić politykę depolonizacji i totalnej rusyfikacji białoruskich Polaków, której skutki na początku drugiej dekady XXI w. są szczególnie odczuwalne.

Stosunek władzy sowieckiej do polskości na Białorusi świadczy, że jej polityka niszczenia była dobrze przez rządzących koordynowana. Dowodem na to może być fakt, że na Białorusi, w odróżnieniu od Litwy i Ukrainy, polskie życie społeczne wcale nie istniało i nie było warunków do jego odrodzenia aż do gorbaczowskiej „pieriestrojki".

Nowa polska (w pierwszym pokoleniu) inteligencja partyjna, piastująca kierownicze stanowiska w strukturze władzy partyjnej i administracyjnej, została przez najwyższe kierownictwo ZSRR wciągnięta do procesu sowietyzacji i rusyfikacji Polaków w BSRR i w tym procesie nie była zwykłym obserwatorem, lecz jego czynnym uczestnikiem i gorliwym wykonawcą.

Tadeusz Gawin — doktor nauk humanistycznych w dziedzinie historii, polski działacz społeczny w Białorusi. Zainteresowania badawcze: historia polskiej mniejszości narodowej w Białorusi w XX-XXI ww.

Алена Ізергіна
(Полацк)

Беларуская этнічная група ў Літве ў святле тэорыі „дыяспары катаклізму”

Адной з найважнейшых праблем сучаснасці, на думку шэрагу навукоўцаў, з’яўляецца вывучэнне малых этнічных груп, што абумоўлена зменай ролі апошніх у жыцці нацыянальнай радзімы і прымаючай краіны пад уплывам розных фактараў як лакальнага, так і агульнасусветнага значэння. Адэкватнае ўяўленне рэалій сацыякультурнага развіцця дыяспары па-за межамі метраполіі дазваляе вырашаць досыць шырокае кола пытанняў, цесна звязаных з этнічным кантэкстам. Дыяспары фарміруюцца ў залежнасці ад навакольных умоў, сярод якіх вызначальнымі з’яўляюцца сацыяльна-эканамічныя і этнапалітычныя. Вынік трансфармацыйных працэсаў у кожным выпадку можа быць індывідуальным, таму даследаванні канкрэтных умоў і спецыфікі фарміравання этнічных груп дастаткова значныя. Праблема гістарычнага фарміравання этнічных груп і выяўленне іх спецыфічных рыс з’яўляецца вельмі актуальнай.

У накірунку даследавання ўзаемаадносін паміж краінай зыходу, краінай пасялення і дыяспарай даследчыкамі вылучаюцца розныя падыходы, у якіх зроблены спробы растлумачыць феномен сучасных дыяспар, прычыны іх узнікнення. Традыцыйна пад дыяспарай разумеюць частку народа (этнічнай супольнасці), якая пражывае па-за краінай свайго паходжання, мае агульныя этнічныя карані і духоўныя каштоўнасці. Для дыяспары характэрна ўсведамленне сябе часткай народа, які жыве ў іншай дзяржаве, наяўнасць уласнай стратэгіі ўзаемаадносін з дзяржавай пражывання і гістарычнай радзімай[1]. Роджэрс Брубейкер (прафесар-сацыёлаг з ЗША) вылучае адмысловую падгрупу дыяспар — „дыяспары катаклізму”, якія склаліся ў сувязі з дэзынтэграцыяй і распадам буйных дзяржаўных утварэнняў і са зменай палітычных меж. Дыяспары катаклізму ў адрозненне ад гістарычных і працоўных дыяспар, узнікаюць імгненна, у выніку рэзкай змены палітычнага ладу, насуперак жаданням людзей[2]. Асноўная ідэя разгляду дыяспары не перамяшчэнне людзей праз межы, а змена саміх меж.

[1] В. Коваль, *Кантакты беларускай і ўкраінскай дыяспар міжваеннага перыяду,* „Białoruskie Zeszyty Historyczne”, 2009, z. 32 s. 258-264.

[2] В. Д. Попков, *Феномен этнических диаспор*, Москва 2003.

У сваёй працы „«Диаспоры катаклизма» в Центральной и Восточной Европе и их отношение с родинами" Роджэрс Брубекер сцвярджае, што „дыяспару катаклізму" неабходна ахарактарызаваць як постполінацыянальную, якая ўзнікае ў выніку дэзынтэграцыі вялікіх поліэтнічных палітычных утварэнняў — распаду Расійскай, Габсбургскай імперый пасля Першай сусветнай вайны, Савецкага Саюза, Югаславіі і Чэхаславакіі па завяршэнні халоднай вайны[3]. Гэта грандыёзная рэарганізацыя палітычнай прасторы па нацыянальнай прыкмеце ўвасабляла ідэю нацыі-дзяржавы, калі межы нацыі і дзяржавы павінны супадаць. Навуковец разглядае сістэму „дыяспара — радзіма — прымаючая краіна" і вылучае ідэю, што „нацыяналізацыя" раней поліэтнічнай палітычнай прасторы стварае тры ўзаемазвязаныя тыпы нацыяналізму. Першы тып — „нацыяналізуючы" нацыяналізм новых незалежных дзяржаў (альбо дзяржаў са змененымі межамі). Ён мае на ўвазе палітыку, якая праводзіцца ў імя „тытульнай" нацыі альбо „галоўнай" нацыі. Тытульная нацыя ўспрымаецца як законная „ўладальніца" дзяржавы, а сама дзяржава разумеецца як дзяржава гэтай нацыі і для гэтай нацыі. Аднак, нягледзячы на ўладанне „ўласнай" краінай, апошняя лічыць свае пазіцыі слабымі і таму стварае „баявыя парадкі", лічучы дадзеную сітуацыю вынікам дыскрымінацыйнай палітыкі ў адносінах да сябе, якая праводзілася да атрымання незалежнасці. Гэта ўяўная дыскрымінацыя з'яўляецца апраўданнем „кампенсацыйнай" стратэгіі выкарыстання ўсёй улады дзяржавы ў мэтах „галоўнай" нацыі[4].

Другі тып — „нацыяналізм" радзімы, арыентаваны на грамадзян іншых краін, якія ўспрымаюцца ў якасці этнакультурна роднасных. „Радзіма" лічыць сваім правам і абавязкам сачыць за тым, як жывуць „супляменнікі" ў іншых краінах, аказваць ім рознага накірунку дапамогу, падтрымліваць іх палітычную актыўнасць, іх арганізацыі і інш. У цэлым — абараняць правы і інтарэсы „сваіх". Падобныя прэтэнзіі выклікаюць найбольшы рэзананс, калі „сваім" пагражае нацыяналізуючая палітыка дзяржавы, у якой яны пражываюць. Такім чынам нацыяналізм радзімы нараджаецца ў прамой апазіцыі і ў дынамічным узаемадзеянні з нацыяналізмам нацыяналізуючай дзяржавы. Нацыяналізуючы нацыяналізм і нацыяналізм радзімы не ўяўляюць сабой узаемавыключаючых з'яў[5].

[3] Р. Брубекер, *«Диаспоры катаклизма» в Центральной и Восточной Европе и их отношение с родинами*, «Диаспоры. Независимый научный журнал», Москва 2000, № 3.

[4] Там жа.

[5] Там жа.

Трэці тып створаны самімі „дыяспарамі катаклізму”. Нацыяналістычныя памкненні і погляды меншасці ўключаюць хутчэй „нацыянальныя”, чым „этнічныя”, патрабаванні ад улад прызнаць іх асобую нацыянальную групу і даць ім калектыўныя, заснаваныя на нацыянальнасці, правы — культурныя альбо палітычныя. Падобныя самаадчуванні і адпаведныя ім палітычныя перакананні адрозніваюць „дыяспары катаклізму”[6].

У выніку геапалітычных падзей на працягу XX — пачатку XXI ст. палітычная карта Цэнтральнай і Усходняй Еўропы змянялася тройчы — пасля Першай і Другой сусветных войнаў, распаду Савецкага Саюза. Сфарміраваны Роджэрсам Брубекерам прынцып вывучэння дыяспары стаў асновай даследавання гісторыі фарміравання беларускай этнічнай групы ў Літве ў канцы XIX — пачатку XXI стст. Тэрыторыя даследавання — сучасныя межы Літоўскай дзяржавы.

На пачатку XX ст. — этнічныя беларускія тэрыторыі ўваходзілі ў склад адзінай дзяржавы — Расійскай імперыі. Агульнасць тэрыторыі, з якой непарыўна звязаны пэўныя прыродна-геаграфічныя і кліматычныя ўмовы, а значыць і характар працоўнай дзейнасці людзей, іх побыт, матэрыяльная і духоўная культура, фарміраванне і развіццё агульнай мовы, звычаяў і традыцый, нормаў маралі з’яўляецца перадумовай фарміравання этнасу. Насельніцтва мае аднолькавы гістарычны лёс, а гістарычная памяць — аснова для ўзнікнення і развіцця нацыянальнай самасвядомасці. Другая палова XIX — пачатак XX ст. характарызуецца ўздымам нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Вільня з’ўлялася цэнтрам нацыянальнага жыцця, дзе друкаваліся беларускія перыядычныя выданні „Наша доля” і „Наша ніва”, „Саха”, „Biełarus”, „Гоман”; працавалі Беларускае выдавецкае таварыства, выдавецтвы „Нашай нівы”, „Загляне сонца і ў наша ваконца”, выдавецкае таварыства „Наша хата”, Беларускі музычна-драматычны гурток[7]. У 1903 г. адбыўся ўстаноўчы сход першай беларускай нацыянальнай партыі — Беларускай рэвалюцыйнай грамады[8]. Згодна даных перапісу 1897 г. беларусы складалі 56% насельніцтва Віленскай губерні[9].

У выніку палітычных падзей 1914-1922 гг. была сфарміравана новая карта Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Этнічныя беларускія тэрыто-

[6] Там жа.

[7] У. Філякоў, *Беларусь у пачатку XX ст. Культура*, [у:] *Гісторыя Беларусі: У 6 т.*, т. 4: *Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII — пачатак XX ст.)*, Мінск 2007.

[8] М. В. Біч, *Станаўленне буржуазнага грамадства*, [у:] *Нарысы гісторыі Беларусі*, Мінск 1994.

[9] *Виленская губерния. Первая Всеобщая Перепись населения Российской Империи. 1897 год*, Портал „Российяка империя.info” [дата доступу: 12.03.2015], <http://rusemp.vpvd.ru/perepis1897/vilno.html>.

рыі ўвайшлі ў склад Польскай і Літоўскай Рэспублік, БССР і РСФСР. Тэрыторыя сучаснай Літвы ў выніку Першай сусветнай і польска-савецкай войнаў была падзелена на дзве часткі: заходнюю — утворана Літоўская Рэспубліка са сталіцай у Коўне, усходнюю — Віленскае ваяводства, якое з’яўлялася адміністрацыйнай адзінкай II Рэчы Паспалітай. Цэнтрамі беларускага жыцця міжваеннага перыяду былі Вільня і Коўна. Дзяржаўная палітыка Польскай і Літоўскай Рэспублік адрозніваліся, але можна вылучыць агульныя этапы:

1. Ліберальны (актывізацыя дзейнасці беларусаў: былі адкрыты навучальныя ўстановы; СМІ; грамадскія і палітычныя арганізацыі) — першая палова 20-х гг. XX ст.;
2. Радыкальны (скарачэнне беларускіх навучальных устаноў; СМІ; ліквідацыя грамадскіх і палітычных аб’яднанняў) — другая палова 20-х — 30-я гг. XX ст.

У міжваенны перыяд для беларускай этнічнай супольнасці ў Літве (у сучасным разуменні тэрыторыі краіны) былі характэрнымі тры тыпы нацыяналізму, вылучаныя Р. Брубекерам. Так, на тэрыторыі Віленскага ваяводства „нацыяналізм” дыяспары быў рэалізаваны праз адкрыццё беларускіх грамадскіх, культурных арганізацый: у 1919 г. у Вільні пачала сваю дзейнасць Беларуская гімназія, якая заклала аснову нацыянальнай сістэмы адукацыі ў Заходняй Беларусі, у 1921 г. былі заснаваны Таварыства беларускай культуры і Беларускі музей, у 1926 г. — Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры. Дзейнічалі ў гэты час на Віленшчыне і грамадска-палітычныя арганізацыі беларусаў — Беларускі нацыянальны камітэт, Беларуская сялянска-работніцкая грамада і іншыя[10]. З 1926 па 1939 гг. адбываецца змена ліберальнага накірунку на больш радыкальны — „нацыяналізуючы” нацыяналізм — перыяд, калі палітыка Польскай дзяржавы была накіравана на адзіны курс унутранага жыцця з дамінаваннем прадстаўнікоў польскай нацыі.

Пра колькасць беларусаў на тэрыторыі Віленшчыны даюць інфармацыю даныя перапісаў 1921 і 1931 г. Так, на тэрыторыі чатырох паветаў Віленскага ваяводства (без уліку насельніцтва Сярэдняй Літвы) згодна даных перапісу 1921 г. пражывала 47,3% беларусаў ад усёй колькасці насельніцтва[11]. У 1931 г. 59,7% насельніцтва назвалі польскую мову роднай, сярод нацыянальных меншасцей лічыліся: белару-

[10] А. Ціхаміраў, *З гісторыі беларускай дыяспары ў Літве*, [у:] *Дыяспара. Культуралогія. Гісторыя*, Мінск 2006, с. 30-36.
[11] *Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej*, t. VII, Warszawa 1923.

сы (22,7%), рускія (3,4%), габрэі (8,5%) і літоўцы (5,5%)[12]. Даныя перапісу засноўваліся на моўным і рэлігійным прынцыпах. Прадстаўнік каталіцкай канфесіі — паляк, размаўляеш на польскай мове — паляк, — гэта хібы перапісаў, калі каменданты паліцыі называлі праваслаўных сялян беларусамі, а сялян-каталікоў — палякамі[13]. У дадзеным выпадку рэлігійная прыналежнасць з'яўлялася крытэрыем вызначэння этнічнай. Другі момант, чалавечы фактар — калі самі беларусы прыпісвалі сябе да палякаў, каб атрымаць ільготы, зямлю і іншае, — можна сцвярджаць, што большасць „палякаў" на тэрыторыі Заходняй Беларусі — грамадзяне-беларусы.

Для другога перыяду былі характэрны асіміляцыя і паланізацыя далучаных тэрыторый праз насаджэнне польскамоўных школ, закрыццё навучальных устаноў з беларускай мовай навучання. Так, на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1922/1923 навучальным годзе былі 32 беларускія школы[14]. У 1937/1938 навучальным годзе ў Заходняй Беларусі дзейнічалі толькі 5 польска-беларускіх пачатковых школ, 1 беларуская гімназія, у 44 польскіх школах беларуская мова вывучалася як прадмет. У 1930-я гг. рух за беларускую школу трансфармаваўся ў культурна-асветніцкі, дзе галоўнае месца адводзілася самаадукацыі. Дэпутат Ванда Пэлчынская ў сваіх прамовах у сейме лічыла мэтазгодным стварыць умовы для легальнай дзейнасці беларускіх палітычных і грамадскіх інстытутаў. Такія адзінкавыя выступленні ў сейме ў абарону беларусаў (іх прадстаўнікоў пасля 1935 г. там ужо не было), хоць і з прагматычных пазіцый польскай ліберальнай буржуазіі, не ўнеслі карэктываў у нацыянальную палітыку Польшчы[15].

Яскравай выразніцай свядомасці мясцовага насельніцтва Заходняй Беларусі была літаратура. Асноўным цэнтрам выдавецкай справы была Вільня. З 233 найменняў беларускай перыёдыкі 221 выдаваліся ў Вільні[16], сярод якіх газеты „Беларуская справа"[17], „Беларуская ніва"[18], „Бе-

[12] *Wykaz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej*, t. 1: *Województwo Wileńskie*, Warszawa 1938.

[13] С. Токць, *Беларуская вёска ў эпоху зьменаў. Другая палова XIX — першая трацiна XX ст.*, Менск 2007, с. 204.

[14] А. Вабішчэвіч, *Нацыянальная школа: складанасці развіцця (1921-1939 гг.)*, [у:] *Назаўсёды разам: Да 60-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР*, Мінск 1999, с. 60.

[15] Там жа, с. 66.

[16] А. Вабішчэвіч, *Духоўнае жыццё ва ўмовах паланізацыі*, [у:] *Гісторыя Беларусі: У 6 т.*, т. 5: *Беларусь у 1917-1945 гг.*, Мінск 2007.

[17] Літоўскі цэнтральны гістарычны архіў (далей: ЛЦГА), ф. 51, воп. 7, спр. 153, л. 1.

[18] ЛЦГА, ф. 51, воп. 7, спр. 283, л. 10.

ларускі кліч”[19], газета-аднадзёнка „Водклік”[20]. З 466 беларускамоўных кніг і брашур, надрукаваных у 1920-1930-я гг. у Польшчы, 98% прыпадала на Вільню: тут размяшчаліся друкарні і выдавецтвы, сярод якіх — Беларускае выдавецкае таварыства, выдавецтвы Уладзіслава Знамяроўскага, Барыса Клецкіна, Таварыства беларускай школы, Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, Беларускае каталіцкае выдавецтва[21], кнігарня Станіслава Станкевіча[22] і інш.

У Літоўскай дзяржаве згодна даных перапісу 1923 г. беларусамі запісаліся 4400 асоб (0,2% насельніцтва). Беларускае насельніцтва канцэнтравалася ў ваколіцах Нова-Аляксандраўска і Еўя. Галоўным цэнтрам дзейнасці беларусаў у Літве стала Коўна. Як і на тэрыторыі Віленскага ваяводства, „нацыяналізм” дыяспары меў сваё ўвасабленне ў дзейнасці грамадскіх, адукацыйных і культурных арганізацый. У 1919-1920 гг. тут дзейнічалі Міністэрства беларускіх спраў у Літве[23], Выдавецкае таварыства імя Францыска Скарыны, выдаваліся перыядычныя выданні[24][25], фарміраваліся беларускія вайсковыя адзінкі, якія падпарадкоўваліся літоўскаму камандаванню[26].

Значнай падзеяй стала заснаванне ў Коўне ў красавіку 1923 г. Беларускага цэнтра, галоўнымі задачамі якога былі выдавецкая дзейнасць для абслугоўвання Заходняй Беларусі, падтрыманне сувязей з грамадскімі арганізацыямі ў Заходняй Беларусі, выступленні на міжнароднай арэне ў абарону беларускіх і літоўскіх нацыянальных інтарэсаў.

У другой палове 1920-х гг. становішча беларусаў на Літве рэзка пагоршылася. Найперш гэта стала наступствам палітыкі, якую праводзілі ў адносінах да беларусаў літоўскія ўлады. Не спрыялі літоўскія ўлады і развіццю беларускага школьніцтва на тэрыторыях, дзе кампактна пражывалі беларусы. Новая хваля ажыўлення беларускага жыцця — пачатак 1930-х гг. У 1932 г. было заснавана Беларускае культурна-асветнае таварыства, галоўныя задачы якога — „арганізацыя беларускай меншасці і праца над узаемным беларуска-літоўскім яднаннем”[27]. Альтэрнатывай БКАТ стаў Беларускі цэнтр, які аднавіў сваю дзейнасць у сталіцы Літвы 23 лютага 1933 г., галоўнай мэтай

[19] ЛЦГА. ф. 51, воп. 7, спр. 520, л. 3.
[20] ЛЦГА, ф. 51, воп. 7, спр. 283, л. 11.
[21] А. Вабішчэвіч, *Духоўнае жыццё ва ўмовах паланізацыі...*
[22] М. Русак, *Лявонава доля*, Вільня 2000.
[23] ЛЦГА, ф. 395, воп.1, спр. 1.
[24] ЛЦГА, ф. 395, воп.1, спр. 15, л. 15-17.
[25] ЛЦГА, ф. 395, воп.1, спр. 9.
[26] ЛЦГА, ф. 395, воп.1, спр. 5, л. 13.
[27] А. Ціхаміраў, *З гісторыі беларускай дыяспары ў Літве...*

якога было аб’яднанне і каардынацыя дзейнасці асобных беларусаў і беларускіх арганізацый усёй Літвы. Спрэчкі паміж рознымі арганізацыямі знізілі эфектыўнасць дзейнасці беларусаў у Літве. У 1935-1936 гг. практычна ўсе беларускія арганізацыі ў Літве спынілі сваю дзейнасць з прычыны арганізацыйных і фінансавых цяжкасцей.

Неабходна адзначыць, што ў міжваенны перыяд „нацыяналізуючы” нацыяналізм для беларусаў Літоўскай і Польскай Рэспублік стаў вынікам знешняй палітыкі, якую праводзілі дзяржавы непасрэдна пасля атрымання незалежнасці. Урад кожнай з рэспублік разлічваў на падтрымку беларусаў з мэтай рэалізацыі сваіх мэт, сярод якіх галоўнай была спрэчка за Віленшчыну. Пасля вырашэння гэтага пытання ўзаемаадносіны з прадстаўнікамі нацыянальнай меншасці сталі насіць іншы характар. Таксама неабходна ўлічваць, што колькасць беларусаў на тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі была невялікая, а на тэрыторыі Віленскага ваяводства беларусаў значна большая, але 80% пражывала ў сельскай мясцовасці. Такім чынам, у першым выпадку не маглі займаць дамінуючых пазіцый з-за малалікасці, а ў другім — адсутнасці адпаведнай адукацыі і патрэбы: галоўная праца селяніна — на зямлі, ад якой залежыць яго жыццё і дабрабыт. Рухавіком нацыянальнага жыцця была інтэлігенцыя.

Пытанне „нацыяналізм” радзімы мае свае адметнасці. Неабходна вызначыць, якая з дзяржаў на этнічных беларускіх тэрыторыях мае правы метраполіі. У тэрытарыяльным вызначэнні перавагу мае БССР, але палітычны лад і дзейнасць не адпавядаюць статусу: кантроль з боку СССР за беларускім жыццём і праявамі беларускасці ў БССР, рэпрэсіі супраць беларускай інтэлігенцыі. Калі разглядаць узаемаадносіны паміж беларусамі Заходняй Беларусі і БССР, то тут пытанне дапамогі „радзімы” мела палітычны і ідэалагічны характар. На тэрыторыі Літвы беларусы пражывалі адасоблена, размова ідзе толькі пра ўзаемадзеянне паміж беларусамі Літвы і беларускімі суполкамі свету.

З пачаткам Другой сусветнай вайны спыняе сваё існаванне ІІ Рэч Паспалітая, Заходняя Беларусь была далучана да БССР. Беларуская мяжа была зрушана на захад, але ў склад БССР не былі ўключаны этнічныя беларускія тэрыторыі: згодна тэксту Дамовы аб перадачы Літоўскай Рэспубліцы горада Вільні і Віленскай вобласці і аб узаемадапамозе паміж Савецкім Саюзам і Літвой ад 10 кастрычніка 1939 г. частка паўднёва-ўсходняй Літвы і Вільня былі перададзены Літве.

Падчас уваходжання Вільні ў склад Польшчы ў 1922-1939 гг. літоўскае насельніцтва зменшылася да 0,5%. Таму пасля перадачы Віленскага краю Літве згодна дагавору літоўскі ўрад пачаў палітыку засялення Вільні і іншых гарадоў літоўцамі, асабліва ў выніку рэпрэсій савецкай улады ў дачыненні да беларускай інтэлігенцыі ў самой Віль-

ні ў верасні-кастрычніку 1939 г. Літоўцы засялялі Вільню і іншыя гарады і мястэчкі краю пасля ліквідацыі гітлераўскімі і літоўскімі паліцэйскімі карнымі падраздзяленнямі габрэяў. Такая ж палітыка засялення праводзілася і пасля 1945 г. савецкім урадам Літвы[28]. Так, згодна ўспамінаў Міраславы Русак: „... як прыйшлі саветы пачаліся рэпрэсіі. Немцы не забаранялі нічога беларускага: працавала Віленская гімназія, якая была адкрыта ў 1919 г. Апошні выпуск гімназіі — вясна 1944 г., а там прыйшла савецкая ўлада з вызваленнем Вільні ад немцаў. Забаранялі беларускае. Нашы асвабадзіцелі „асвабадзілі" ад усяго беларускага: гімназіі, касцёла, царквы, музею, друку... Наша інтэлігенцыя была абвешчана „нацыяналістамі". Змагацца за беларускасць сталася небяспечна — гэта было ўсё роўна, што падпісаць сабе прыгавор. Пачаліся арышты, бацьку [Станіслава Станкевіча — аўт.] пасадзілі. З саветамі прыйшло новае жыццё"[29].

Вільня стала сталіцай Літоўскай дзяржавы, тут канцэнтраваліся адміністрацыйныя ўстановы. У савецкі перыяд нязначная колькасць беларусаў перасялялася ў Вільню і іншыя гарады Літвы па вярбоўцы, на новабудоўлі і г.д., асабліва з памежных раёнаў Беларусі. Так, згодна ўспамінаў Валдаса Банайціса: „У савецкі час у Нова Вільні пачалі будаваць заводы, а хто на іх рабіў? ... прыязджалі беларусы — на заводзе грошы можна было зарабіць. Вучыцца спецыяльна не нада: на месцы месяц, другі павучаць і рабі. І ім было да беларускай культуры? Не, гэта ўчарашнія людзі, якія працавалі на зямлі. Яны прыязджалі з мэтай зарабляць грошы, а не займацца культурай"[30]. Прыязджалі працаваць і ў калгасы Літвы. Справа ў тым, што селянін у Літве меў зямельны надзел большы, чым селянін у БССР. Таму беларусы пасля вайны пераязджалі жыць у Літву[31]. Яшчэ адзін накірунак міграцыі беларускага насельніцтва ў Літву — адукацыйны: беларусы пераязджалі ў Вільню з мэтай атрымання адукацыі. Так, са слоў інфарманткі Леакадзіі Мілаш, яна прыехала навучацца ў Віленскі ўніверсітэт і засталася жыць у Вільні[32]. Такім чынам, беларуская этнічная група ў савецкі час у Літве фарміравалася ў большасці з карэннага насельніцтва былога Віленскага ваяводства.

Змена дзяржаўнай мяжы ў свядомасці жыхара былога Віленскага ваяводства мела сваё адлюстраванне і разуменне. Мяжа, якая падзялі-

[28] А. Грыцкевіч, *Беларусы ў Літве*, „Філаматы", 2004, № 2 (9).

[29] Запісана аўтарам ад Міраславы Русак 25.03.2015 г., г. Вільня.

[30] Запісана аўтарам ад Валдаса Банайціса 24.03.2015 г., г. Вільня.

[31] Запісана аўтарам ад Валянціна Стэха 30.09.2015 г., г. Вільня.

[32] Запісана аўтарам ад Леакадзіі Мілаш 23.03.2015 г., г. Вільня.

ла Беларусь на Заходнюю і Усходнюю ў 1921 г., стала вызначальным фактарам ва ўспрыняцці беларуса ўсходняй часткі. Так, згодна ўспамінаў Людвікі Кардзіс: „Я нарадзілася 46 кіламетраў ад Вільні ў Астраўцы. У нас у сям'і гаварылі па-беларуску. Вільня ніколі не была для мяне чужым горадам, яна была ў крыві. Мінск — у нас казалі, што там жывуць рускія. Для нас Вільня была родным горадам: людзі ехалі на працу, вучыцца. Гэта было натуральным, што я вось прыехала ў Вільню і засталася”[33].

Прыток беларусаў прывёў да павелічэння колькасці беларускай этнічнай групы. Так, па даных усесаюзных перапісаў насельніцтва, у 1959 г. у Літоўскай ССР пражывала 30 тысяч беларусаў, у 1979 г. — 58 тысяч[34]. Аднак павелічэнне колькасці беларускага насельніцтва ў Літоўскай ССР не прывяло да ажыўлення беларускага нацыянальнага жыцця ў рэспубліцы. Прычын некалькі. Па-першае, тэрыторыі Літоўскай дзяржавы і Заходняй Беларусі з пачаткам Другой сусветнай вайны ўвайшлі ў адзіную дзяржаву — СССР. Адна з галоўных мэт унутранай палітыкі — фарміраванне савецкай нацыі. Другое, механізмы ўплыву на насельніцтва праз сістэму ўнутранай бяспекі. Трэцяе, вялікая колькасць рэпрэсаванай з прыходам савецкай улады беларускай інтэлігенцыі.

Вышэйразгледжаны перыяд (1945-1985 гг.) — характарызуецца „нацыяналізмам” радзімы, у якасці якой выступае СССР. Паміж саюзнымі рэспублікамі — Літоўскай ССР і Беларускай ССР — існавалі эканамічныя, культурныя сувязі, але па-за ўвагай засталіся нацыянальныя працэсы, становішча этнічных меншасцей.

Новая хваля працэсу этнічнай мабілізацыі беларусаў у Літве — другая палова 1980-х — звязаны з палітыкай перабудовы. У БССР, як і ва ўсім Савецкім Саюзе, пачалі заўважацца пэўныя прыкметы лібералізацыі і дэструкцыі савецкага грамадства. Пачалі ўзнікаць першыя беларускія культурна-асветныя арганізацыі. У 1988 г. быў арганізаваны клуб аматараў беларускай народнай творчасці „Сябрына”[35], Таварыства беларускай культуры[36].

Са спыненнем існавання Савецкага Саюза мяжа паміж дзвюма незалежнымі краінамі стала важным аспектам у жыцці беларусаў у Літве. У савецкі перыяд мяжа існавала, але ў той самы час не было патрэбы вырашаць усе дакументальныя пытанні, каб выехаць у Літву. З атрыманнем незалежнасці адміністрацыйная мяжа паміж былымі

[33] Запісана аўтарам ад Людвікі Кардзіс 24.03.2015 г., г. Вільня.
[34] А. Ціхаміраў, *З гісторыі беларускай дыяспары ў Літве ...*
[35] Запісана аўтарам ад Валянціна Стэха 30.09.2015 г., г. Вільня.
[36] Запісана аўтарам ад Леакадзіі Мілаш 23.03.2015 г., г. Вільня.

савецкімі рэспублікамі ператварылася ў паўнавартасную мяжу паміж незалежнымі дзяржавамі. На самаадчуванне суродзічаў, іх зносіны з бацькаўшчынай уплывае візавы рэжым паміж Літвой і Беларуссю, уведзены з сакавіка 1994 г. З улікам наяўнасці ў Літве этнічных беларусаў для пэўных іх катэгорый зроблены выключэнні, прадстаўлены льготы. З 1994 г. дзейнічае спрошчаны парадак (па пропусках) перасячэння дзяржаўнай мяжы жыхарамі памежных тэрыторый, але ў той самы момант існуюць і нявырашаныя пытанні[37].

Пасля абвяшчэння незалежнасці Літвы і Беларусі, распаду СССР становішча беларускай дыяспары ў Літве істотна змянілася. Пачаўся працэс вяртання беларусаў на бацькаўшчыну, але разам з тым не перапыніўся і выезд іх у Літву. У 1992-1999 гг. у Беларусь прыехала больш за 13,4 тыс. чалавек, а выбыла ў Літву больш за 3 тысячы[38].

